ГЦБС г.Гродно
Гродзенская гарадская цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма

# Кніжная скарбніца ў хвалях часу

## гісторыя і сучаснасць Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка

Гродна 2013




**Кніжная скарбніца ў хвалях часу: гісторыя і сучаснасць Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Я.Макаёнка: гістарычны нарыс / Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма; уклад.: Свірыда Н.Р.; рэд.: Ілюшына І.М.- Гродна, 2013. – 49 с.**

Вашай увазе прапануецца невялікі гістарычны нарыс, прысвечаны Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А.Я.Макаёнка. Нарыс складаецца з раздзелаў: ***І.Нялёгкае мінулае (1946-1986); ІІ.Неспакойнае ўчора (1987-2010); ІІІ.Цікавае сёння і фантастычнае заўтра (2011 – 2012); ІV.Гісторыя бібліятэкі ў асобах і дадаткаў “Біяграфіі кіраўнікоў”, “Галерэя партрэтаў супрацоўнікаў”***.

Выданне можа быць цікавым для бібліятэкараў, работнікаў і кіраўнікоў устаноў культуры і адукацыі, настаўнікаў, выкладчыкаў бібліятэчных дысцыплін і ўсіх, хто не абыякавы да гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі.

*Кожны народ не без роду і племя і мае*
*Летапіс свой і гісторыі след на старонках.*
***М.Гусоўскі***
*...І знікне будучыня, калі не будзе гісторыі.*
***А.Пашкевіч***

# Уступ

Мы існуём у свеце хваляў. Усе навакольныя з'явы, грамадскія працэсы маюць хвалепадобны характар і разгортваюцца ў рытмах, зададзеных стваральнай сілай. Касмічныя, зямныя і грамадскія хвалі супадаюць рытмічна – актывізуецца жыёццядзейнасць на планеце, у людзей нараджаюцца светланосныя намеры, мэты, ідэі. Адна з такіх светлых ідэй ператварылася ў жыццё ў далёкім 1946 годзе. У Гродна нарадзілася бібліятэка... Працэс нараджэння адбываўся ў блуканнях па пакутах у пасляваенным горадзе, калі цяжка было знайсці ўцалеўшыя ад разбурэнняў будынкі і памяшканні.

Пра тое, як пасля нараджэння дзейнасць бібліятэкі набывала моц, як нягледзячы на перашкоды і вечны недахоп памяшканняў, яна хутка развівалася, актыўна абслугоўвала жыхароў горада Гродна, расказваецца ў гэтым гістарычным нарысе, менавіта ў ***частках І.Нялёгкае мінулае (1946-1986) і ІІ.Неспакойнае ўчора (1987-2010).***

Сённяшні дзень Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка, яе здабыткі, дасягненні і праблемы – змест ***Часткі ІІІ.Цікавае сёння і фантастычнае заўтра (2011 – 2012).*** Завяршае нарыс ***Частка IV. Гісторыя бібліятэкі ў асобах*** з ***дадаткамі №1 Біяграфіі кіраўнікоў і №2 Галерэя партрэтаў супрацоўнікаў***, дзе расказваецца пра работнікаў і кіраўнікоў, якія ўнеслі значны ўклад у дзейнасць установы культуры на працягу яе існавання.

У стварэнні ***Часткі І.Нялёгкае мінулае (1946-1986)*** вялікую ролю адыграла праца па пошуку дакументаў у Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці (вул. Дзяржынскага, 84), якую правяла загадчык інфармацыйна-бібліяграфічнага сектара Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка Ілюшына Іна Мікалаеўна.

Хвалі часу, па якіх плыла ўстанова культуры нібы карабель пры розных умовах надвор'я, не заўсёды былі лагоднымі і спрыяльнымі. Няхай гэта паэтычнае параўнанне стварае своеасаблівы кантраст у дачыненні да дастаткова празаічнай і нават месцамі пакутлівай гісторыі бібліятэкі.

Як Сусвет вечны, так хвалі часу і духоўнай плыні будуць заўсёды ахінаць нас, абуджаць да творчай дзейнасці. І ў гэтым працэсе няхай Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка застанецца прамяністай кніжнай скарбніцай, натхняльнікам і стваральнікам культурнага жыцця ў горадзе Гродна.

## Частка I. Нялёгкае мінулае (1946-1986)



Гродна пасляваенны...



Гродзенцы з гонарам вытрымалі цяжкія выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны. Гітлераўцы авалодалі горадам у ноч з 26 на 27 чэрвеня 1941 года. За тры акупацыйныя гады фашысты забілі і закатавалі ў Гродна 33 тысячы грамадзян, разбурылі большасць прамысловых прадпрыемстваў, школ, бальніц, культурна-асветных устаноў, знішчылі 25% жылога фонду. Аднаўленне горада пачалося яшчэ ў ходзе вайны з 24 ліпеня 1944 года. У ліпені-верасні 1944 года жыхары Гродна адпрацавалі на аднаўленні прамысловых прадпрыемстваў, камунальнай гаспадаркі, транспарце і сувязі 60 000 гадзін. 20 верасня 1944 года Гродна стаў цэнтрам Гродзенскай вобласці. Ужо да канца 1944 года ў горадзе было адноўлена 17 прамысловых прадпрыемстваў, а ў 1945 – яшчэ 6 прадпрыемстваў. Але ўвага надавалася не толькі аднаўленню прамысловасці. У канцы кастрычніка 1945 года быў арганізаваны культасветаддзел Гродзенскага гарвыканкама. Былі створаны, адкрыты, арганізаваны новыя ўстановы культуры і мастацтва: дзіцячая музычная школа №1 (1944), мастацка-вытворчыя майстэрні Мастацкага фонду БССР (1946), Гродзенскі абласны драматычны тэатр (1947), абласное аддзяленне Беларускага тэатральнага грамадства (1947).

У плане работы культасветаддзела Гродзенскага гарвыканкама на красавік - май 1946 года была пастаўлена задача прадаставіць самастойныя памяшканні для гарадской бібліятэкі і дзіцячай бібліятэкі, аснашчэнні іх неабходным інвентаром і папаўненні кнігамі.

1946 год можна па праву лічыць годам заснавання гарадскіх агульнадаступных бібліятэк. На працягу другога паўгоддзя 1946 года гарадскія бібліятэкі - дарослая і дзіцячая - пачалі абслугоўваць чытачоў з дапамогаю перасовак. Іх па гораду было арганізавана 17. Асабліва добра працавалі перасоўкі на піўзаводзе, швейнай фабрыцы. У справаздачы культасветаддзела за 1946 год запісана: ***“таварышы на месцы прасоўваюць кнігі ў масы і часта мяняюць перасоўкі”.***

Умовы працы перасоўных бібліятэк былі вельмі цяжкія. Да верасня 1946 года абедзве бібліятэкі знаходзіліся ў адным пакоі - памяшканні рэдакцыі абласной газеты “Гродзенская праўда”. У канцы верасня па прапанове сакратара ГК КПБ таварыша Ціханчука бібліятэкі былі пераведзены на вуліцу Горкага, у будынак, які прадназначаўся для Дома піянераў. Калі “блукаючыя

па пакутах” бібліятэкі былі нарэшце пераведзены па дадзенаму адрасу, то апынуліся яшчэ ў горшых умовах, чым былі. Адзін пакойчык без вокнаў і дзвярэй не дазваляў бібліятэцы працаваць, як паўнацэнная ўстанова культуры, а тым больш, зусім не было ўмоў для абслугоўвання чытачоў. У дадатак да гэтага, у першую ноч пасля наваселля адбыўся крадзёж кніг. Тэрмінова быў выдзелены новы пакой у гэтым жа памяшканні. Але абслугоўванне чытачоў так і не было наладжана. У справаздачы на канец **1946** года, падпісанай загадчыкам культасветаддзела С.Левінай, дадзены наступныя тлумачэнні: ***“Асабліва дрэнна ідуць справы з уваходам у бібліятэку. З вуліцы Горкага знаходзіцца гараж пагранічнікаў, якія паставілі вартавых і не дазваляюць хадзіць у бібліятэку. Другі ход загароджаны архірэем (заўвага аўт. - памяшканнем, якое належыла прадстаўніку духавенства), і ў бібліятэку няма магчымасці трапіць”.***

На 1 студзеня **1946** года фонд гарадской бібліятэкі налічваў усяго **260** кніг. У **1946** - пачатку **1947** года гарадская бібліятэка для дарослага чытача абслугоўвала з дапамогаю **26** перасовак каля **1000** чытачоў. На 1 студзеня **1947** года фонд бібліятэкі ўзрос да **900** кніг. А ўлетку на перасоўкі былі адабраны ўжо **460** кніг. Цалкам фонд бібліятэкі на гэты час складаў **2230** кніг (з іх - мастацкай літаратуры было **1500,** грамадска-палітычнай - **350,** прыродазнаўчай - **103** экземпляры). У справаздачы культасветаддзела ёсць толькі кароткія статыстычныя звесткі аб гарадской дзіцячай бібліятэцы. На канец **1946** года яе фонд складаў ужо каля **3000** экземпляраў. І зазначана, што ў дзіцячай бібліятэцы колькасць кніг за **1946** год узрасла ўдвая.

У Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці (Гродна, вул.Дзяржынскага, 84) захаваліся дакументы, якія сведчаць пра рэгістрацыю гарадской бібліятэкі для дарослага чытача і гарадской дзіцячай бібліятэкі, якія працавалі спачатку разам і знаходзіліся ў адным памяшканні (Дом піянераў па вул. Горкага). Гэта рэгістрацыйныя пасведчанні №1 і №2 ад 13 лютага **1947** года.


КОМИТЕТ ПО ДЕЛАМ
КУЛЬТУРНО-ПРОСВЕТИТЕЛЬНЫХ
УЧРЕЖДЕНИЙ
при Совете Министров БССР

Форма № 2
УТВЕРЖДЕНО
Уполномоченным Госплана Совета
Министров СССР по БССР
27 августа 1946 г. № 204

РЕГИСТРАЦИОННОЕ СВИДЕТЕЛЬСТВО №: 2

Библиотека Городская библиотека
(название)
Находящаяся при Культпросветотделе
Зарегистрирована 13 февраля 1947 г. №
Отдела культурно-просветительной работы

Зав. отделом культурно-
просветительной работы

Такім чынам, гарадская дзіцячая бібліятэка і гарадская бібліятэка для дарослага чытача былі заснаваны адначасова, нават працавалі ў адным памяшканні ў **1946 – 1947** гадах, выкарыстоўваючы перасоўныя пункты выдачы літаратуры на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях. Гарадская дзіцячая бібліятэка стала ў **1954** годзе Гродзенскай абласной дзіцячай бібліятэкай імя А.С.Пушкіна. Гісторыя сцвярджае, што цяперашні дзіцячы філіял Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Карскага і Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка маюць адзін гістарычны пачатак, адзін юбілей на дваіх.

У **1947** годзе гарадская бібліятэка для дарослых атрымала нарэшце асобнае памяшканне ў занёманскай частцы горада Гродна па адрасе вуліца Гарнавых, 21 (заўвага аўт. – домік знаходзіўся на тэрыторыі гарбарнага завода і на сённяшні дзень не захаваўся). Менавіта ў гэтай частцы Гродна была сканцэнтравана гарадская прамысловасць.

У справаздачы загадчыцы культасветаддзела С.Левінай за першае паўгоддзе **1947** года зазначана: ***"...для бібліятэкі адрамантавана памяшканне з 4-х пакояў у занёманскай частцы горада, і з 1 лютага гарадская бібліятэка пачынае работу па выдачы кніг, адначасова адкрываецца і маленькая чытальная зала. У сувязі з тым, што фонд бібліятэкі яшчэ вельмі малы, давялося значна скараціць колькасць перасовак (з 26 да 5). Бібліятэка мае патрэбу ў дадатковых сродках на набыццё літаратуры. Адпушчаныя сродкі - 8000 рублёў – будуць поўнасцю рэалізаваны ў ліпені месяцы. Бібліятэка таксама мае патрэбу ў абсталяванні".***

З тых жа дакументаў даведваемся, што паўнацэннае стацыянарнае абслугоўванне чытачоў у гарадской бібліятэцы пачалося не 1 лютага, як хацелася загадчыку культасетаддзела тав. Левінай, а 1 ліпеня **1947 года,** праз чатыры месяцы пасля афіцыйнай даты рэгістрацыі па новым адрасе.

Гарадская бібліятэка ў прамысловым мікрараёне Гродна была неабходна жыхарам горада, хоць на прадпрыемствах і ў навучальных установах ужо працавалі **26** невялікіх бібліятэк. Загадчык культасветаддзела С.Левіна добра гэта разумела. З архіўных дакументаў **1947** года вылучаюцца яе справаздачы з наступнымі аргументамі пра патрэбу жыхароў горада ў культурна-асветніцкіх установах: ***"У занёманскім раёне да сяго часу няма ніводнай культурна-асветніцкай установы, акрамя гарадской бібліятэкі, якая на днях адкрываецца. Няма ніводнага кінатэатра, а між тым, у занёманскім раёне размешчаны асноўныя фабрыкі і заводы горада. Ёсць вялікая неабходнасць у будоўлі кінатэатру ў гэтым раёне, і не толькі кінатэатру, там неабходны дом культуры, улічваючы, што памяшканне, адведзенае зараз пад бібліятэку, можа задаволіць патрэбнасці занёманскага раёна толькі на адзін-два гады".*** (заўвага аўтара - памяшканне гэта выкарыстоўвалася пад бібліятэку 12 гадоў - да 1959 года).

У справаздачы выконваючай абавязкі загадчыка гарадскога культасветаддзела тав. Мяльніцкай, якая чамусьці часова змяніла на пасадзе Левіну, на 1 снежня **1948** года было зафіксавана: ***"У абедзвюх бібліятэках быў праведзены рамонт, яны забяспечаны палівам, у бібліятэках цёпла і ўтульна. Якасць кніг добрая. Усе новыя кнігі, якія выйшлі 1947-48гг., маюцца ў бібліятэцы. Ёсць навукова-папулярная і грамадска-палітычная літаратура, але наяўны фонд кніг у бібліятэках не задавальняе попыт чытачоў, колькасць якіх хутка павялічваецца. У гарадской бібліятэкі вельмі маленькае памяшканне. Чытальня-зал не задавальняе. Няма***

***кнігасховішча. Неабходна падумаць аб павелічэнні памяшкання гарадской бібліятэкі. Праводзяцца ў бібліятэцы і на прадпрыемствах гучныя чытанні, гутаркі, лекцыі, чытацкія канферэнцыі”.***

У архіўных дакументах засведчаны наступныя статыстычныя паказчыкі дзейнасці гарадской бібліятэкі для дарослага чытача на канец **1948** года: чытачы – **825** чалавек, кніжны фонд – **5700** экз.



І.В.Воранаў - чытач бібліятэкі з 1947 года

Адзін са старэйшых чытачоў бібліятэкі Іван Васільевіч Воранаў ўспамінае: ***“Бібліятэка размяшчалася ў маленькім драўляным доміку па вуліцы Гарнавых. Там было два пакойчыкі і калідорчык, усюды стаялі стэлажы з кнігамі. Працавалі дзве дзяўчыны да позняга вечара, так як чытачоў было вельмі шмат, усе вучыліся і хацелі атрымаць новыя кнігі. Гэта былі вучні школ №6 і №9, рабочыя гарбарнага завода і тытунёвай фабрыкі.”***

З плану работы бібліятэкі на красавік-чэрвень **1949** года, які захаваўся ў архіве, можна выявіць прозвішчы работнікаў бібліятэкі на той час: Ніна Сямёнаўна Піваварава, Ефрасіння Ягораўна Трусава, Ганна Захараўна Бурута. Загадчыкам была Н.С.Піваварава. Захавалася першая справаздача бібліятэкі за студзень-красавік **1949** года. Тэкст справаздачы цікава прывесці ў першапачатковым выглядзе, з выкарыстаннем моўных абаротаў і выразаў аўтара:

***“Гарадская бібліятэка размешчана ў прамысловым раёне горада. Гарадская бібліятэка з’яўляецца адным з культурных ачагоў за Нёманам. У трох невялікіх пакоях размешчаны абанемент і чытальная зала. Па-мастацку аформлены памяшканні: партрэтамі Леніна, Сталіна, Марксам, Молатавым. Па-мастацку аформлены пяцігадовы план Сталінскіх работ за 1945-50гг., пяцігадовы план БССР, Палітбюро ЦК ВКПб. Гэта фотамантаж, у якім перыядычна мяняюцца фота згодна знамянальных дат. Газетная вітрына са свежымі газетамі, кніжныя выстаўкі і іншыя, - усё гэта стварае ўтульнасць у бібліятэцы. Чытачы розных узростаў з задавальненнем прыходзяць у бібліятэку за добрай кнігай, пачытаць газеты, часопісы, культурна адпачыць.***

***Бібліятэка мае добрую падборку кніг усіх класікаў, сучасных пісьменнікаў, палітычную, 22 тома сачыненняў Леніна, 9 тамоў сачыненняў Сталіна і тэхнічную.***

***Бібліятэка часта праводзіць масавую работу. З вялікім задавальненнем чытачы ідуць у бібліятэку паслухаць лекцыю, гутарку, гучнае чытанне. Бібліятэка папулярная сярод насельніцтва. За гэтыя месяцы 1949 года бібліятэка павялічыла кніжны фонд на 115 экземпляраў. Цяпер кніжны фонд складае 6805 экземпляраў.***

*Перарэгістрацыю прайшлі 1200 чытачоў. Кніжных выставак да знамянальных дат зроблена 25. Гутарак праведзена 27, індывідуальных – 34, фотамантажоў – 4, лекцый на літаратурныя і палітычныя тэмы - 8, сярод якіх аб жыцці і дзейнасці М.Горкага, А.С.Пушкіна, В.І. Леніна, да 31 гадавіны Савецкай Арміі і інш.*










*Праведзена чытацкая канферэнцыя па раману В.Ажаева “Далёка ад Масквы”. Рыхтуем чытацкую канферэнцыю па раману лаўрэата Сталінскай прэміі М.Бабаеўскага “Кавалер Залатой зоркі” і літаратурны вечар да 150-годдзя з дня нараджэння А.С.Пушкіна. Працуе літаратурны гурток. Прапрацаваны творы лаўрэатаў Сталінскай прэміі “Далёка ад Масквы” В.Ажаева, “Шчасце” П.Паўленкі, “Знаменосцы” А.Ганчара. На прадпрыемствах лесазаводу №7 прачытаны раман сярод рабочых “Як гартавалася сталь” М.Астроўскага. У шавецкай арцелі – раман “Белая бяроза” Бубеннага.*

*Гарадская бібліятэка спаборнічае з Лідскай гарадской бібліятэкай. У спаборніцтве за 1948 год наша бібліятэка выйшла пераможцай.*

*13 мая 1949 года Півapapава”*

У першым паўгоддзі **1950** года на камплектаванне гарадской бібліятэкі выдзелена **11000** рублёў, за першае паўгоддзе было выкарыстана **4500** рублёў на набыццё кніг. Крыніцы камплектавання бібліятэкі - Белкніжкультгандль, кніжны магазін Ваенгандлю і Саюздруку. Літаратура была поўнасцю апрацавана і занесена ў інвентарныя кнігі. Фонд бібліятэкі за **1950** год папоўніўся **1616** экземплярамі кніг.

У архіўных дакументах за **1950** год ёсць ужо больш падрабязныя звесткі пра супрацоўнікаў гарадской бібліятэкі:

1. ***Піваварава Ніна Сямёнаўна***, *1915 года нараджэння, настаўніца, скончыла педвучылішча, адукацыя сярэдняя, загадчык гарадской бібліятэкі са студзеня 1948 года.*
2. ***Бурута Ганна Захараўна***, *1926 года нараджэння, адукацыя сярэдняя спецыяльная, скончыла бібліятэчны тэхнікум, бібліятэкар, працуе са жніўня 1948 года.*
3. ***Трусава Ефрасіння Ягораўна***, *1925 года нараджэння, адукацыя сярэдняя спецыяльная, скончыла бібліятэчны тэхнікум, бібліятэкар, працуе са студзеня 1949 года.*
4. ***Груль Вольга Ільінічна***, *1921 года нараджэння, скончыла 7 класаў польскай школы, прыбіральшчыца, працуе з лютага 1948 года.*

У канцы **1950** года ў гарадской бібліятэцы для дарослых усе статыстычныя паказчыкі значна ўзраслі: колькасць чытачоў на канец года складала ўжо **2800,** колькасць кніжнага фонду – **10615.**

Памяшканне бібліятэкі за **1950** год было адрамантавана, але па сваёй плошчы не задавальняла ні бібліятэкараў, ні чытачоў. І таму 3 жніўня **1951** года Гродзенскім гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных было прынята Рашэнне №758, пункт №7 якога прапаноўваў домаўпраўленням №19 і №20 перасяліцца з памяшкання гарадской бібліятэкі ў занёманскай частцы горада. А для таго прадпісвалася начальніку гаржылупраўлення таварышу Кіевічу знайсці новыя памяшканні для домаўпраўленняў. Рашэнне падпісана старшынёй выканкама гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Г.Пяткевічам.

Дакумент сведчыць, што бібліятэка дзяліла памяшканне ў невялікім драўляным доміку па вуліцы Гарнавых, 21 з домаўпраўленнямі №19 і №20.

На працягу **1952-1953** гадоў у бібліятэцы хутка мяняліся загадчыкі: Піваварава змянілася Новікавай, Новікава – таварышам Кірылічыкам, таварыш Кірылічык – таварышам Івановай.

Пра загадчыка тав. Новікаву Розу Іванаўну ніякіх звестак няма. Кірылічык пакінуў пра сябе ў архіве толькі інфармацыю аб адсутнасці спецыяльнай бібліятэчнай адукацыі і вопыту работы. Таварыш Іванова мела незаконччаную вышэйшую бібліятэчную адукацыю. Такім чынам, амаль усе супрацоўнікі гарадской бібліятэкі мелі спецыяльную адукацыю і стаж работы 2-6 гадоў.

Зазначана, што з прыходам новага загадчыка тав. Івановай палепшылася работа бібліятэкі. Актыўна пачалі праводзіцца масавыя мерапрыемствы. Самыя распраўсюджаныя формы бібліятэчных мерапрыемстваў на той час - чытацкая канферэнцыя і літаратурны вечар. Яны не маглі праводзіцца ў бібліятэцы з-за адсутнасці памяшкання. Таму чатыры чытацкія канферэнцыі і адзін літаратурны вечар бібліятэкары правялі на прадпрыемствах.

Колькасць чытачоў у гарадской бібліятэцы ў **1952** годзе складала **3120** чалавек. Па-ранейшаму бібліятэка дзяліла памяшканне з домаўпраўленнямі, і давялося нават закрыць чытальную залу для наведвальнікаў, каб там размясціць **14 869** экзэмпляраў кніжнага фонду. Усе гэтыя цяжкасці апісвае ў сваёй апошняй справаздачы за **1952** год знаёмая нам ужо загадчык гарадскога культасветаддзела С.Левіна.

На працягу **1953** года ў апараце аддзела культасветработы і бібліятэцы адбыліся кадравыя змены. Аддзел культасветработы стаў гарадскім аддзелам культуры і яго ўзначаліў(ла) спачатку Мелентовіч, затым Кашпар. А ў гарадской бібліятэцы зноў змяніўся загадчык, і былі звольнены два бібліятэкара. У бібліятэку прыйшлі працаваць новыя кадры. З першых супрацоўнікаў засталася толькі Бурута Г.З., якая і была прызначана загадчыкам. Фонд кніг на канец **1953** года налічваў ужо каля **18000** экземпляраў. У **1953** годзе было выдзелена на камплектаванне бібліятэкі

18000 рублёў, якія былі поўнасцю выкарыстаны на набыццё кніг.

1954 год адметны ў гісторыі бібліятэкі тым, што ўпершыню з мэтаю праверкі работы і аказання метадычнай дапамогі сюды была накіравана загадчык абанементнага аддзела Гродзенскай абласной бібліятэкі тав. Фількіна. Ёю быў складзены падрабязны і даволі дакладны акт абследавання гарадской бібліятэкі ад 26 чэрвеня 1954 года.

У акце зазначаны кадравы састаў, які зноў напалову змяніўся ў параўнанні з 1953 годам. Кадры бібліятэкі выглядалі наступным чынам:

***Бурута Г.З.**, загадчык, адукацыя сярэдняя спецыяльная, стаж работы ў бібліятэцы 6 гадоў.*

***Міцкевіч В.Ф.**, бібліятэкар, закончыла культасветвучылішча, працуе адзін год у дадзенай бібліятэцы.*

***Банчык Л.Б.**, бібліятэкар, завочна вучыцца ў педінстытуце на трэцім курсе, працуе ў дадзенай бібліятэцы 3 месяцы.*

***Сіманкова Г.Ц.**, бібліятэкар, адукацыя сярэдняя, працуе 2 месяцы.*

Чытаем акт спецыяліста абласной бібліятэкі, і перад намі паўстаюць фрагменты тагачаснага інтэр'еру бібліятэкі, яе мастацкага афармлення. Вось апісанне бібліятэкі: 6 двухбаковых і 4 аднабаковыя стэлажы расстаўлены ў невялікім пакойчыку, адна шафа ў куточку для захоўвання адзення. Чытальнай залы няма, усе маленькія пакойчыкі занятыя кнігамі, усяго 5 сталоў выкарыстоўваюцца і для абслугоўвання чытачоў, і для арганізацыі працоўных месцаў бібліятэкараў.

У памяшканні, дзе адбываецца выдача кніг, на сценах размешчаны 2 фотамантажных кампазіцыі на тэмы: "Вялікі правадыр і сябар У.І.Ленін", "А.М.Горкі – пісьменнік і грамадзянін". Побач са сталом абслугоўвання вісіць на сцяне плакат, афармлены бібліятэкарамі, прысвечаны рашэнням Вераснёўскага Пленума ЦК КПСС. Далей уздоўж сцяны на некалькіх паліцах афармлены кніжныя вітрыны (цяпер іх назвалі б выставамі) на тэмы: "Вывучайце гістарычныя рашэнні Вераснёўскага Пленума ЦК КПСС", "Аб цудоўным, што ёсць у прыродзе, раскажуць гэтыя кнігі", "Навінкі літаратуры".

Кніжны фонд бібліятэкі на гэты час ужо складае 20969 экземпляраў. З прац класікаў марксізма-ленінізма ёсць творы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна. Ёсць працы дзеячоў сельскагаспадарчых навук: Мічурына, Лысенкі, Вільямса. У 1954 годзе на камплектаванне было выдзелена 17000 рублёў. На момант наведвання бібліятэкі было выкарыстана 5000 рублёў - набыта 1340 экземпляраў кніг. Значыць, кошт адной кнігі ў сярэднім на той час складаў 15-20 рублёў.

Цікавасць для нас уяўляе падпіска на перыядычныя выданні ў гарадскую бібліятэку ў 1954 годзе. Выпісваліся 15 назваў газет і 32 назвы часопісаў - падпіска на перыядычныя выданні, якой можа пазайздросціць і сучасная бібліятэка. Перыядычныя выданні амаль па ўсіх галінах ведаў, цікавыя і разнастайныя газеты і часопісы прапанаваліся чытачам. Наяўнасць у пераліку

дзіцячых перыядычных выданняў сведчыць аб тым, што бібліятэка абслугоўвала дзяцей.

| Падпіска на газеты і часопісы для Гродзенскіх гарадской бібліятэкі для дарослых і дзіцячай бібліятэкі ў 1954 годзе | | |
|---|---|---|
| **Газеты** | **Часопісы** | |
| 1. Известия | 1. Коммунист | 17. Колхозник Белоруссии |
| 2. Правда | 2. Молодой коммунист | 18. Новый мир |
| 3. Комсомольская правда | 3. Новое время | 19. Октябрь |
| 4. Пионерская правда | 4. Работница | 20. Театр |
| 5. Литературная газета | 5. Работніца і сялянка | 21. Радио |
| 6. Советский спорт | 6. Семья и школа | 22. Физкультура и спорт |
| 7. Труд | 7. Звезда | 23. Вожатый |
| 8. Советская Белоруссия | 8. Крокодил | 24. Вокруг света |
| 9. Звезда | 9. Мурзилка | 25. Молодость мира |
| 10. Гродненская правда | 10. Пионер | 26. Вожык |
| 11. Сталинская молодёжь | 11. Смена | 27. В защиту мира |
| 12. Зорька | 12. Техника молодёжи | 28. Крестьянка |
| 13. Пионер Белоруссии | 13. Беларусь | 29. Вопросы экономики |
| 14. Советская культура | 14. Полымя | 30. Коммунист Белоруссии |
| 15. Колхозная правда | 15. Бярозка | 31. Советская торговля |
| | 16. Культпросветработа | 32. Клуб |

У дакуменце бібліятэкара абласной бібліятэкі Фількінай зазначана таксама, што створаны сістэматычны каталог. Часопісныя і газетныя артыкулы толькі пачалі распісвацца, такім чынам, сістэматычная картатэка артыкулаў пачала існаванне з **1954** года. Менавіта з гэтага года пачалося стварэнне і алфавітнага каталога.

Бібліятэка мела ў **1954** годзе **5** перасоўных пунктаў, на дзейнасць якіх былі складзены дагаворы. Пачала дзейнічаць сістэма абслугоўвання па МБА, калі заказваліся выданні з рэспубліканскай бібліятэкі імя Леніна ў Мінску.




У справаздачы загадчыка гарадскога аддзела культуры тав. Кашпар адзначана, што ў **1954** годзе бібліятэка правяла цікавыя мерапрыемствы, сярод якіх чытацкія канферэнцыі па творах Натана Рыбака “Пераяслаўская Рада”, Антаніны Капцяевай “Іван Іванавіч”, Віліса Лаціса “Да новага берага”, Веры Кетлінскай “Дні нашага жыцця”.




Літаратурныя вечары, прысвечаныя А.Пушкіну, М.Горкаму, А.Чэхаву, М.Астроўскаму дапаўняюць агульную карціну масавай работы “занёманскай” гарадской бібліятэкі. Менавіта так яе называюць у справаздачах 50-х гадоў.

Такім чынам, у **1954** годзе бібліятэка зрабіла значны крок у сваім развіцці, з’явілася поўная і разнастайная падпіска на перыядычныя выданні, пачаў стварацца паўнацэнны даведачна-бібліяграфічны апарат, вялася цікавая масавая работа з чытачамі.

Але памяшканне бібліятэкі па-ранейшаму заставалася маленькім,

адсутнасць чытальнай залы ўплывала на арганізацыю масавай работы. Фонд быў размешчаны ў некалькіх маленькіх пакойчыках. Рашэнне Савета дэпутатаў працоўных ад 21 жніўня **1951** года аб перамяшчэнні з драўлянага доміка па вуліцы Гарнавых,21 домаўпраўленняў №19 і №20 у іншае памяшканне з мэтаю вызвалення плошчы пад чытальную залу бібліятэкі не было выканана. Гэты сумны факт і адзначыў у сваёй справаздачы за **1954** год новы загадчык гарадскога аддзела культуры тав. Кашпар.

**1956** год у жыцці бібліятэкі вызначыўся значнымі патрасеннямі і зменамі кадраў. Трэба зазначыць, што кадры хутка мяняліся таксама ў аддзеле культуры. Загадчык гарадскога аддзела культуры Павукоў, які працаваў на гэтай пасадзе ўсяго год, паспеў арганізаваць у сакавіку праверку дзейнасці гарадской бібліятэкі. Вынікі праверкі былі сумныя. У архіве захаваўся ганебны Загад №8 па Гродзенскаму гарадскому аддзелу культуры ад 23 сакавіка **1956** года, падпісаны Павуковым, дзе зазначана: ***“Праверкай устаноўлена, што гарадская бібліятэка працуе незадавальняюча. Работнікі бібліятэкі - загадчыца Бурута Г.З, бібліятэкары Банчык Л.Б. і Сіманкова Г.Ц.– безадказна ставяцца да сваёй працы. Усім аб’яўляецца строгая вымова.”***

Вынікам праверкі была змена загадчыцы: Бурута, якая працавала амаль з першых дзён стварэння бібліятэкі, была звольнена. На яе месца прыйшла **Фёдарава Яўгенія Баніфацьеўна,** якой было загадана ў кароткі тэрмін пазбавіцца ад недахопаў у дзейнасці бібліятэкі.

Адначасова з кантролем за арганізацыяй работы гарадской цэнтральнай бібліятэкі загадчык аддзела культуры тав. Павукоў рыхтаваў матэрыялы аб адкрыцці асобнай дзіцячай бібліятэкі ў горадзе на разгляданне выканкама гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.

21 кастрычніка **1957** года, што пацверджана архіўнымі дакументамі, для гарадской дзіцячай бібліятэкі быў часова выдзелены маленькі пакойчык 10-ці квадратных метраў пры СШ №13, каб потым перавесці яе ў новае памяшканне пабудаванага дома ў занёманскай частцы горада (па вул. Цітова, 13).

У **1957** годзе нарэшце было выканана Рашэнне Савета дэпутатаў працоўных, прынятае шэсць гадоў таму, і домаўпраўленні №19 і №20 пераехалі ў іншае памяшканне, асвабадзіўшы плошчы для чытальнай залы (20 квадратных метраў) і кнігасховішча (14 квадратных метраў) гарадской бібліятэкі па вул. Гарнавых,21.

Менавіта ў **1957** годзе ў бібліятэку на пасаду загадчыка абанемента прыйшла працаваць **Барэль Марыя Іванаўна,** адукаваная і творчая асоба, якая затым стала яе загадчыкам, памяць аб якой ушаноўваецца супрацоўнікамі гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка і сёння.

Значная падзея адбылася ў гісторыі бібліятэкі 23 студзеня **1959** года. Нарэшце ажыццявіўся пераезд у новае памяшканне на вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў, 51/2.


Будынак, у якім з 1959 года размяшчаецца бібліятэка

З таго часу адрас бібліятэкі застаўся нязменным на доўгія гады. Гарадская бібліятэка размясцілася на першым паверсе цаглянага трохпавярховага жылога дома. Яна сустракае гарадскога чытача ў гэтым жа памяшканні і ў XXI стагоддзі.

З атрыманнем новага памяшкання на вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў здавалася, што пакуты бібліятэкі ў **1959** годзе скончыліся. Чатыры пакоі, агульная плошча якіх складала **176** квадратных метраў! Пасля шматгадовай цеснаты гэта здавалася нават раскошаю. З'явіліся нарэшце чытальная зала, асобнае кнігасховішча. Атапленне было цэнтральнае, што вельмі ўзрадавала супрацоўнікаў, якім даводзілася ў мінулым тапіць печкі.

Але статус гарадской бібліятэкі і рост колькасці кніжнага фонду і чытачоў праз дзесятак гадоў пачалі дыктаваць новыя ўмовы для якаснай арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва горада. Калі вярнуцца да архіўных дакументаў **1959** года, то можна даведацца, што загадчык **Фёдарава Яўгенія Баніфацьеўна** ўжо на той час адзначала не вельмі добрыя ўмовы для камфортнага абслугоўвання чытачоў: ***"...няма толькі зручнасцей, якія патрабуюцца для бібліятэкі. Па-першае – няма гардэробу, у чытальнай зале даводзіцца займацца ў паліто".*** Фёдарава Я.Б. не ведала, што гардэробу ў бібліятэцы не з'явіцца і праз паўвека... Наведвальнікі мерапрыемстваў бібліятэкі і сёння вымушаны пакідаць адзенне на вешалцы ў чытальнай зале, ці размяшчаць на крэслах. Магчыма таму, што бібліятэка не тэатр, і яна не павінна пачынацца з вешалкі...


Фёдарава Я.Б., загадчык бібліятэкі 1956-1962гг. (у цэнтры). Фота 1997 года са святкавання 50-годдзя ГЦБ

З бібліятэчнага абсталявання ў **1959** годзе былі набыты **10** спецыяльных сталоў для чытальнай залы, **16** новых стэлажоў, **50** крэслаў. Памяшканне бібліятэкі дазваляла разгарнуць ва ўсю моц масавую работу. За **1959** год у бібліятэцы было праведзена **255** масавых мерапрыемстваў, у тым ліку гучных чытанняў – **60**, гутарак – **69,** чытацкіх канферэнцый – **4,** літаратурных вечароў

- 2, аглядаў – 39. Пра такія лічбы цяперашняя цэнтральная бібліятэка нават і не марыць. У чытальную залу прыходзіла 158 назваў часопісаў і 26 назваў газет.

1959 год таксама адметны для гарадской бібліятэкі з'яўленнем фонду, да якога арганізаваны адкрыты доступ чытачоў. 20 красавіка 1959 года гарадская бібліятэка адна з першых бібліятэк Гродзенскай вобласці перайшла да арганізацыі свабоднага доступу да фонду на абанеменце. У справаздачы бібліятэкі за 1959 год зазначана, што свабодны доступ даў значны прырост колькасці кнігавыдач бібліятэкі, асабліва актыўна пачала выдавацца галіновая літаратура. Павялічылася абарачальнасць кніжнага фонду.

За 1960-1961 гады адбыўся значны прырост фонду бібліятэкі. За 1960 год набыта 5648 экзэмпляраў літаратуры, за 1961 – 5425 экзэмпляраў у магазінах і абласным бібліятэчным калектары. Тэмпы прыросту фонду пачатку 60-х гадоў амаль аналагічныя ў колькасным выражэнні тэмпам набыцця новай літаратуры ў 2000-2005 гадах. Можна зрабіць вывад аб прагрэсе ў камплектаванні гарадской бібліятэкі ў 60-х гадах, альбо аб рэгрэсе ў гэтым працэсе ў XXI стагоддзі.

Загадчык Фёдарава Я.Б. у справаздачы за 1960 год указала наступныя лічбы: кніжны фонд – 38673 экзэмпляры, чытачы – 3228 чалавек, кнігавыдача – 69529 экз. Праведзена 339 масавых мерапрыемстваў. Вось гэта колькасць! У сярэднім, 28 мерапрыемстваў штомесячна! Ніводная гарадская бібліятэка сёння не праводзіць такую колькасць мерапрыемстваў. Гэтаму ёсць тлумачэнні. Гучныя чытанні і гутаркі з'яўляліся на той час адной з самых распаўсюджаных форм работы, і падрыхтоўка да іх не патрабавала значных затратаў часу і энергіі. Такіх мерапрыемстваў, як чытацкая канферэнцыя ці літаратурны вечар праводзілася нямнога - у сярэднім, 4 чытацкія канферэнцыі, 2-3 літаратурныя вечарыны штогадова.

Да прыведзеных лічбаў можна, безумоўна, адносіцца з недаверам. Як паказала праверка ў хуткім часе, былі прыпіскі колькасці масавых мерапрыемстваў. Але міжволі выклікае павагу аб'ём работы, які выконвала бібліятэка, тэмпы яе развіцця і паляпшэння бібліятэчнага абслугоўвання жыхароў горада. У 1961 годзе колькасць чытачоў узрасла да 3898 чалавек, фонд павялічыўся да 44098 экзэмпляраў, і паказчык кнігавыдачы таксама не стаяў на месцы - узрос да 73542.

У 1961 годзе гарадскую бібліятэку з мэтаю праверкі арганізацыі работы зноў наведалі спецыялісты абласной бібліятэкі: загадчык абанементнага аддзела Кармушкіна і галоўны бібліёграф В.А.Алышава. У даведцы аб стане работы гарадской бібліятэкі яны адзначаюць станоўчую работу загадчыка абанемента Барэль Марыі Іванаўны, якая разгарнула вялікую дзейнасць па кіраўніцтву чытаннем. Па планах чытання, складзеных ёю, чыталі 150 чалавек. Вельмі добра Марыя Іванаўна арганізавала свабодны доступ да кніжнага фонду, прыгожа афарміла 15 тэматычных паліц, шырока

выкарыстоўваючы бібліяграфічныя дапаможнікі. У даведцы спецыялістаў абласной бібліятэкі выказана думка аб распаўсюджванні сярод бібліятэк перадавога вопыту работы гарадской цэнтральнай бібліятэкі.


Барэль М.І.- заг. бібліітэкі (1962-1971)

Але ўжо 13 красавіка **1962** года над бібліятэкай зноў згусціліся хмары. Загадам па гарадскому аддзелу культуры за безадказныя адносіны да працы, прыпіскі ў колькасці масавай работы ў першым квартале была звольнена з пасады загадчык Фёдарава Я.Б. Загадчыкам бібліятэкі стала **Барэль М.І.**

З **1963** года гарадская бібліятэка пачала змагацца за **званне "Бібліятэка выдатнай працы".** Праца па абслугоўванню чытачоў вялася ў напружаным рытме – без выхадных дзён, з 11 да 21 гадзіны. Разам з "сястрой" – гарадской бібліятэкай – за званне "Бібліятэка выдатнай працы" змагалася і дзіцячая бібліятэка, якая ні ў чым не хацела адставаць, мела ўжо сваё асобнае памяшканне, актыўна абслугоўвала маленькіх чытачоў і вяла масавую работу.

У **1964** годзе былі адкрыты перасоўныя аддзелы на **18** прадпрыемствах горада: велазаводзе, мэблевай фабрыцы, тыпаграфіі, лесагандлёвай базе, сілікатным заводзе і іншых. Колькасць чытачоў у **1964** годзе дасягнула **5393** чалавек, ім было выдадзена **77259** дакументаў з кніжнага фонду аб'ёмам **53475** экземпляраў.

І нарэшце заслужаная і доўгачаканая перамога! У архівах захаваўся дакумент, які сведчыць аб працоўных дасягненнях гарадской бібліятэкі для дарослых і дзіцячай бібліятэкі горада Гродна ў пачатку 60-х гадоў.

*Пастанова*
*Савета упраўлення культуры Гродзенскага прамысловага аблвыканкама*
*і прэзідыума абкома прафсаюзаў работнікаў культуры ад 26 сакавіка 1964 года*

***Аб прысваенні звання "Бібліятэка выдатнай працы" бібліятэкам горада Гродна і Лідскай гарадской дзіцячай бібліятэцы***

***Разгледзеўшы матэрыялы Лідскага і Гродзенскага гарадскіх аддзелаў культуры аб прысваенні звання "Бібліятэка выдатнай працы" Гродзенскай гарадской і дзіцячай бібліятэкам і Лідскай гарадской дзіцячай бібліятэцы Савет Упраўлення культуры прамысловага аблвыканкама і Прэзідыум абкома прафсаюза работнікаў культуры пастанавіў:***

***1. Прысвоіць званне "Бібліятэка выдатнай працы"***
***А. Гродзенскай гарадской бібліятэцы (загадчык тав. Барэль)***
***Б. Гродзенскай дзіцячай бібліятэцы (загадчык тав.Бернацкая)***
***В. Лідскай гарадской дзіцячай бібліятэцы (загадчык тав.Воласава)***

***Нач. упраўлення культуры Гродзенскага прамысловага аблвыканкама Асмелоўская Е.***
***Старшыня Прэзідыума абкома прафсаюза работнікаў культуры Кузьміч Г.***

Такіх поспехаў дасягнуў калектыў гарадской бібліятэкі ў складзе **6**-ці чалавек бібліятэкараў са спецыяльнай адукацыяй і прыбіральшчыцы, якія мелі зусім невялікія аклады:

***Барэль М.І.*** *загадчык, скончыла бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, працавала з акладам 80 рублёў.*

***Банчык Л.Б.,*** *загадчык чытальнай залы, вучыцца на ІІІ курсе Гродзенскага педагагічнага інстытута, працавала з акладам 66 руб.13 кап.*

***Асвецінская І.П.,*** *загадчык перасоўнага фонду, скончыла бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, працавала з акладам 72 руб. 50 кап.*

***Старчак Н.С.,*** *бібліятэкар, скончыла бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, працавала з акладам 60 руб.*

***Сіманкова А.Т.,*** *бібліятэкар, скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум, працавала з акладам 45 руб. 20 кап.*

***Груль О.І.,*** *прыбіральшчыца, працавала з акладам 15 руб.*

**1965-1968** гады прайшлі для бібліятэкі ў творчай, напружанай працы па абслугоўванню чытачоў. У бібліятэку штогадова запісвалася каля **5,5** тысяч чалавек. Для гарадской бібліятэкі ў гэты перыяд характэрны даволі высокі паказчык кнігавыдачы – больш **93000** экземпляраў штогод. Колькасць масавых мерапрыемстваў, праводзімых за год таксама ўражвае - **250**! Дзейнічала **15** бібліятэк-перасовак. Набывалася штогадова каля **4000** экземпляраў новых кніг, што складае палову ад колькасці новых паступленняў кніг у сістэму з 15-ці бібліятэк горада Гродна ў **2007-2010** гадах!

**1968** год асабліва вылучаецца актывізацыяй работы па заахвочванню чытачоў, рэкламе бібліятэкі, калі казаць сучаснай моваю. У справаздачы загадчыка **Барэль Марыі Іванаўны** адзначана: ***“У 1968 годзе бібліятэка праводзіла вялікую работу па заахвочванню чытачоў. Вывешвалі аб’явы пра месцазнаходжанне і гадзіны працы бібліятэкі там, дзе збіраецца многа людзей, на прадпрыемствах, у інтэрнатах, магазінах, ашчадных касах, аддзяленнях сувязі. Выступалі з інфармацыяй пра работу бібліятэкі па завадскім радыё, на камсамольскіх сходах, на вытворчых нарадах прадпрыемстваў. Расказвалі пра кніжны фонд, новыя паступленні літаратуры, часопісы, якія выпісвае бібліятэка. Трэба сказаць, што такая форма прапаганды бібліятэкі вельмі эфектыўная. Пасля такой інфармацыі паток чытачоў павялічваецца. Некаторым рабочым, якія ўсё ж не хочуць запісвацца ў бібліятэку, на дамашні адрас высылалі лісты такога зместу:***

***Паважаны таварыш! Гарадская бібліятэка запрашае Вас запісацца ў шэраг чытачоў. У бібліятэцы Вы зможаце атрымаць літаратуру па ўсіх пытаннях, якія Вас цікавяць, па Вашай спецыяльнасці, а таксама газеты і часопісы. Бібліятэка адкрыта: абанементны аддзел з 11 да 21 гадзіны; чытальная зала з 11 да 22 гадзін”***

Да ліста прыкладаўся спіс літаратуры па спецыяльнасці рабочага.



Супрацоўнікі гарадской бібліятэкі (Прыкладна восень 1969 года). Злева - направа: другая - Цыхун Л.М., чацвёртая - Клімантовіч А.М., пятая - Барэль М.І.

Справаздача за **1968** год з’яўляецца для нас вельмі цікавым дакументам з апісаннем рэкламнай кампаніі бібліятэкі, па стварэнню яе станоўчага іміджу ў грамадстве. Рэкламную (на той час прапагандысцкую) дзейнасць бібліятэкі яе загадчыца лічыла прыярытэтнай у **1968** годзе. Менавіта гэта дзейнасць – адзін з прыярытэтаў работы гарадской бібліятэкі імя А.Макаёнка ў XXI стагоддзі. Час ідзе, а прыярытэты дзейнасці бібліятэкі амаль не мяняюцца, традыцыі і акцэнты ў рабоце бібліятэк пераклікаюцца праз дзесяцігоддзі.

З тэкстам справаздачы па арганізацыі прапаганды бібліятэкі і чытання цікава пазнаёміцца да канца:

***“З мэтай прыцягнення ў шэрагі чытачоў усіх працуючых на прадпрыемствах, мы практыкавалі абходы па цахах на замацаваных за бібліятэкай прадпрыемствах з мэтаю давядзення кнігі да кожнага працуючага. У гутарцы з кожным рабочым высвятлялі, у якой бібліятэцы ён чытае, ці мае сваю хатнюю бібліятэку, чым цікавіцца, які ў яго разрад, ці вучыцца ён, ці плануе павышаць сваю кваліфікацыю, якая літаратура яму для гэтага патрэбна.***

***Каб наблізіць кнігі да працоўнага месца рабочага на тых прадпрыемствах, дзе няма сваёй бібліятэкі, былі адкрыты бібліятэкі-перасоўкі. Гэта шклозавод, Гандльмаш, хлебакамбінат, піўзавод, фабрыка афсетнага друку і інш. З мэтай прыцягнення рабочых да чытання вывешваліся аб’явы такога зместу:***

***Чытач!***
***Ці з’яўляецца твой сябар чытачом бібліятэкі?***
***Побач з табой не павінна быць нечытаючых!***

Змест рэкламнай дзейнасці бібліятэкі 60-х гадоў XX стагоддзя, які паўстае з дакументу, можа стаць кіраўніцтвам у арганізацыі гэтай работы ў пачатку XXI стагоддзя. Нават даследаванне інтарэсаў рабочых праводзілася метадам інтэрв'юіравання (апытання на працоўным месцы з загадзя складзеным спісам пытанняў). А аб'ява з такім тэкстам актуальная і арыгінальная для сённяшніх дзён.

Актыўная прапаганда бібліятэкі і чытання прынесла свой плён. У **1969** годзе колькасць чытачоў складала ўжо **6207.** Кнігавыдача **112880** экз. таксама выклікае павагу, таму што сведчыць пра стабільнасць у дзейнасці ўстановы на працягу амаль 30-ці гадоў, да пачатку XXI стагоддзя. Кнігавыдача цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка **2005** года, напрыклад, складала крыху больш за **120000**, калі не ўлічваць дзейнасць бібліятэчнага пункта ў мікрараёне Дзевятоўка.

У **1971** годзе загадчык М.І.Барэль раптоўна памерла. Загадчыкам гарадской бібліятэкі стала **Ніна ІванаўнаТарасава.** Бібліятэка ў справаздачах стала называцца гарадская цэнтральная бібліятэка. На гэты час ужо былі адкрыты ў горадзе бібліятэка №1 (вул. Даватара, 21, 1967 г.), бібліятэка №2 (вул. Белуша, 37, 1968 г.). У 1972 годзе адкрылася бібліятэка №3 (вул. Л.Чайкінай, 49). У адносінах да іх бібліятэка па вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў, 51/2 стала выконваць ролю цэнтральнай. Хоць да цэнтралізацыі бібліятэчнай сістэмы было яшчэ даволі далёка.

Як вынік добрай працы і дасягнення высокіх паказчыкаў у абслугоўванні чытачоў гарадская бібліятэка ў **1971** годзе па выніках **сацыялістычнага спаборніцтва** атрымала пераходны **вымпел "Пераможца ў сацыялістычным спаборніцтве".** Перамогу бібліятэка заваявала з такімі статыстычнымі паказчыкамі:

**Чытачы – 6458**
**Кнігавыдача – 114803**
**Наведванні – 35378**
**Кніжны фонд – 63896**
**Абарачальнасць кніжнага фонду – 1,7**
**Чытальнасць – 17,6**
**Наведвальнасць 5,5**

**1972** год стаў годам пераўліку кніжнага фонду, ачысткі яго ад старой літаратуры. Гэта паўплывала на паказчыкі работы бібліятэкі, якія знізіліся ў параўнанні з **1971** годам. У справаздачы бібліятэкі зазначана, што ў сувязі з праверкай бібліятэчнага фонду чытальная зала пачала абслугоўваць чытачоў толькі з 4 мая **1972** года. Зніжэнне паказчыкаў адбылося яшчэ і па прычыне адкрыцця ў **1972** годзе новай бібліятэкі №3, якую стала наведваць частка чытачоў цэнтральнай бібліятэкі. На канец года па справаздачы бібліятэкі статыстычныя паказчыкі былі наступныя: чытачы – **4700**, кнігавыдача – **70991**, наведванні – **23670**, кніжны фонд – **47419**.

Загадчык Тарасава Н.І. у справаздачы за **1972** год зазначыла: ***“…нармальнай рабоце абанемента перашкаджае выключная цесната, калі няма дзе размясціць літаратуру, не гаворачы ўжо аб раскрыцці яе зместу з дапамогай выставак. Вельмі многа “хадавой” літаратуры давялося ўбраць і скласці ў кнігасховішчы, каб размясціць новыя кнігі. Усё гэта адмоўна ўплывае на абслугоўванне чытачоў. З фондаў было выключана 23000 экземпляраў старой як фізічна, так і маральна літаратуры. Зроблена перастаноўка стэлажоў на абанеменце, а таксама суцэльная рэдакцыя паловы алфавітнага каталогу”.***

Вось гэта тэмпы спісання літаратуры! І гэта не ў цэлым па сістэме бібліятэк ЦБС, а з фондаў адной гарадской бібліятэкі! Калі параўноўваць лічбы спісання літаратуры з фондаў цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка ў пачатку XXI стагоддзя, то яны за тры гады будуць складаць толькі каля 10000 экзэмпляраў!

У **1972** годзе ў бібіятэцы працавалі Тарасава Н.І.(загадчык), Сямашка Г.П. (загадчык абанемента), Нядвецкая Р.Б. (бібліятэкар абанемента), Сіманкоў А.Т. (бібліятэкар), Бялых М.П. (загадчык чытальнай залы), Балоціна В.В. (бібліятэкар чытальнай залы), Камісарава Л.Н. (загадчык перасоўнага фонду).

У **1973** годзе загадчык Тарасава Ніна Іванаўна звольнілася, часова выконваць абавязкі загадчыка стала Сямашка Г.П.



**Бушнева А.А. - першы дырэктар ГЦБС (1975-1987)**

З 1 красавіка **1971** года на пасаду загадчыка цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі па вул. Цітова, 13 была прызначана **Бушнева (Міхасёнак) Аляксандра Аляксандраўна**. А ў кастрычніку **1974** года яна прызначана загадчыкам гарадской бібліятэкі (для дарослых). Пасля цэнтралізацыі масавых бібліятэк Бушнева А.А. стала дырэктарам гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы і цэнтральнай гарадской бібліятэкі (снежань **1975 –** сакавік **1987 гг.**). Разам з новым кіраўніком прыйшлі на работу ў бібліятэку і новыя супрацоўнікі - кадравы склад з **1974** года ўжо іншы.

Высокімі былі статыстычныя паказчыкі працы за **1974** год. Чытачоў было **5905** чалавек, яны наведалі бібліятэку **40514** разоў, ім было выдана **96599** экземпляраў літаратуры. Агульная плошча бібліятэкі была ўсяго **222** квадратных метра. Па-ранейшаму, не хапала плошчы для раскрыцця кніжнага фонду, арганізацыі рабочых месцаў бібліятэкараў.

У **1974** годзе ў СССР і БССР пачаўся падрыхтоўчы этап да дзяржаўнай цэнтралізацыі агульнадаступных бібліятэк. У адпаведнасці з Рашэннем Гродзенскага гарвыканкама №188 ад 08.10.1975 і Загадам гарадскога аддзела культуры гарвыканкама №114 ад 28.11.1975 года адбылася цэнтралізацыя сеткі масавых бібліятэк Гродна. У снежні 1975 года загадчык



Дырэктар Бушнева А.А. і метадыст Юдкіна Л.І. - у творчым адзінстве (1980?)

гарадской бібліятэкі Бушнева А.А. стала дырэктарам гарадской цэнтральнай бібліятэкі і адначасова дырэктарам гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы. Яна была накіравана на двухтыднёвыя курсы ў Маскву, якія былі прысвечаны падрыхтоўцы масавых бібліятэк да цэнтралізацыі.

Пасля вяртання з курсаў Бушнева А.А. пачала рыхтаваць бібліятэкі да цэнтралізацыі, хоць гарадская ЦБС ужо была афіцыйна ўтворана ў адпаведнасці з вышэйпералічанымі дакументамі органаў мясцовай улады. Першым этапам гэтай падрыхтоўчай дзейнасці лічылася стварэнне зводнага сістэматычнага каталога. Амаль адначасова неабходна было ствараць зыходзячы спачатку са сваіх кадраў новыя аддзелы: бібліяграфічны, метадычны, камплектавання і апрацоўкі літаратуры, кнігасховішча. Для гэтага давялося амаль год працаваць з вялікім напружаннем усім супрацоўнікам цэнтральнай бібліятэкі, і толькі ў **1976** годзе былі ўведзены **3** новыя штатныя адзінкі.



Суботнік у гарадскім парку. Сярэдзіна 80-х. Другая злева – дырэктар Бушнева А.А., трэцяя – метадыст Юдкіна Л.І.

У **1976** годзе аддзел камплектавання і апрацоўкі адзінага фонду пераехаў у асобнае памяшканне па вуліцы Камарова, дом 5, дзе і знаходзіўся да кастрычніка **2006** года. Загадчыкамі аддзела былі: з 1975 да 1980 года Старчак Н.С., з 1980 да 1985 года Рыбалка Г.І., з 1985 да 1988 года Цыхун Л.М., з 1989 да 1993 год Казбанава С.Я., з 1995 да 1998 года Зарэцкая Л.І., з 1998 года Макавеева С.С.

Сістэматычны каталог на кніжны фонд 4-х бібліятэк быў створаны ў рэкордныя тэрміны – да чэрвеня **1976** года. У ліпені зводны сістэматычны каталог быў правераны і адобраны спецыяльнай камісіяй Міністэрства культуры БССР.

Тры гады працы, звязанай з дзяржаўнай цэнтралізацыяй, былі вельмі цяжкімі для работнікаў гарадскіх бібліятэк. Кабінетаў для работы не было: метадысты і бібліёграфы працавалі ў чытальнай зале. Бушнева А.А. мела працоўнае месца на абанеменце за стэлажамі з кнігамі, дзе за невялікім сталом павінна была весці і гаспадарчую, і кіруючую работу, маючы толькі адну пішучую машынку на ўсе працэсы работы і тэлефон.

У выніку неаднаразовых зваротаў Бушневай А.А. у гарвыканкам у **1980-1984** гадах была пашырана плошча цэнтральнай бібліятэкі за кошт жылога фонду ў гэтым жа доме. З'явіліся нарэшце два кабінеты: дырэктара, метадыста і бібліёграфа. Ва ўспамінах пра дзейнасць гарадскіх бібліятэк пасля цэнтралізацыі, якія пакінула **Бушнева Аляксандра Аляксандраўна**, зазначана: ***"Штомесячна праводзіліся сходы, дзе прысутнічалі загадчыкі філіялаў, на якіх падводзіліся вынікі работы і ставіліся задачы на будучы месяц. Штоквартальна праводзіліся семінары і заняткі школы прафесійнага майстэрства сумесна з бібліятэкарамі школ. Абавязкова на семінарах ці занятках школы прафесійнага майстэрства паказваліся масавыя мерапрыемствы.***



**Конкурс "А-ну, дзяўчаты!"(1986). Першы рад злева-направа: Бушнева А.А., Юдкіна Л.І. Другі рад: Бычкоўская М.П., Макавеева С.С., Фёдарава Л.Г., Іёвайшытэ І.М., Паплаўская Г.П., Озерава І.Ю., Кмецік Л.Б., Біч Л.М., Ятулевіч В.П.**




**Выстава да 30-годдзя Перамогі (1975г.)**

***Вялікую дапамогу ў рабоце аказвалі і прафсаюзныя сходы, якія адбываліся штоквартальна. На іх падводзіліся вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, што з'яўлялася вялікім стымулам у паляпшэнні работы кожнай бібліятэкі ЦБС. Яскрава і неардынарна праходзіў конкурс "А-ну, дзяўчаты!", свята пасвячэння ў маладыя спецыялісты, арганізатарам якіх з'яўляўся прафкам работнікаў культуры. Рэгулярна ў красавіку праходзілі працоўныя суботнікі ў гарадскім парку.***

Памятка молодого библиотекаря.

МЫ ПРИДЁМ К ПОБЕДЕ
КОММУНИСТИЧЕСКОГО ТРУДА
В.И. Ленин

ДОРОГОЙ ТОВАРИЩ!

Сегодня мы принимаем тебя в наш трудовой коллектив. Ты становишься полноправным членом его.
Помни: человека уважают за труд. С первого дня береги честь работника централизованной библиотечной системы. Будь всегда дисциплинированным, скромным честным работником. По твоим поступкам судят обо всем коллективе библиотеки. Бережно относись к доверенным нам книжным фондам, к другим материальным ценностям.
Помогай коллективу во всех его хороших начинаниях. Постоянно совершенствуй свое профессиональное мастерство. Правильно организуй свой досуг, участвуй во всех мероприятиях коллектива.
ПОЗДРАВЛЯЕМ ТЕБЯ С НАЧАЛОМ ТРУДОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В НАШЕМ КОЛЛЕКТИВЕ! ЖЕЛАЕМ ТЕБЕ УСПЕХОВ В РАБОТЕ И ЛИЧНОГО СЧАСТЬЯ.

Директор ЦБС /А. А. Бушнева/
Председатель МК /М. А. Беляева/

г. Гродно, 1982 г.

***Праводзілася грамадская работа. Амаль усе загадчыцы з'яўляліся членамі метадычнага савета пры аддзеле культуры гарвыканкама, членамі педагагічнага савета школ сваёй зоны абслугоўвання. Я была сакратаром партыйнай арганізацыі работнікаў культуры, затым перадала сакратарства Рыбалка Г.І., на той час загадчыцы філіяла №4, як самаму творчаму, адукаванаму і ініцыятыўнаму работніку. За час работы дырэктарам гарадской цэнтральнай бібліятэкі і дырэктарам ЦБС я двойчы была дэпутатам гарадскога Савета дэпутатаў працоўных.***

***Карацей кажучы, сістэма жыла, займалася творчасцю, дыхала лёгка і свабодна".***




Выстава да 60-годдзя ЛКСМБ (1980)

Цікавая інфармацыя пра дзейнасць гарадской цэнтральнай бібліятэкі знойдзена ў альбоме, афармленым да 60-годдзя Ленінскага камсамола Беларусі. Гэта слаўная дата адзначалася 24 верасня **1980** года. З афармленых матэрыялаў альбома даведваемся, што сярод амаль **7000** чытачоў гарадской бібліятэкі палову складае моладзь.

Цесныя кантакты былі наладжаны паміж бібліятэкай і камсамольскімі арганізацыямі прадпрыемстваў і школ. Асабліва вялікую ўвагу надавала бібліятэка абслугоўванню моладзі, якая працавала на будаўніцтве завода “Сінтвалакно”(цяперашняга “Хімвалакно” як часткі “ГроднаАзот”).




Працуе адна з перасоўных бібліятэк ГЦБ (прыкладна 1979-1980гг.)



Перасоўная бібліятэка ГЦБ у Белкалгаспраекце (1982г.). Карыстальнікі – 150 чалавек. Загадчык – Букоўская В.А.

Для рабочай моладзі ў гонар юбілею камсамола былі праведзены бібліяграфічны агляд літаратуры “Баявы шлях камсамола”, “Што значыць быць сучасным?”, гутарка “Чалавек славіцца працай”, літаратутны вечар “Нам пра дарогі гэтыя забыцца нельга”.

Асаблівую цікаўнасць з боку старшакласнікаў школы-інтэрнату выклікала праведзеная бібліятэкарамі гутарка “Камсамольцы Гродзеншчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны”, на якой моладзь даведалася пра подзвігі М.Белуша, А.Сухамбаева, В.Соламавай.

Аналагічныя мерапрыемствы былі праведзены і цэнтральнай дзіцячай бібліятэкай, якая размяшчалася па вул. Цітова, 13. Пра адно з іх сведчыць наступны фотаздымак.



Гутарка са школьнікамі “Камсамольцы Гродзеншчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны” у памяшканні ЦДБ, прысвечаная 80-годдзю Ленінскага камсамола Беларусі (1980 год)

По ўспамінах А.А.Бушневай, у **1981** годзе Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка стала пераможцай абласнога сацыялістычнага спаборніцтва, калектыў атрымаў грашовую прэмію. Але дакументы пра гэты факт не знойдзены ў архіве.

У **1982** годзе гарадская цэнтральная бібліятэка праводзіла шэраг мерапрыемстваў да 60-годдзя ўтварэння СССР. Бібліяграфічныя агляды “У сям’і вольнай, новай”, “Дружба народаў – дружба літаратур”, чытацкая канферэнцыя па творах Л.Брэжнева “Успаміны” і В.Распуціна “Жыві і памятай”. Для супрацоўнікаў гарадскога парку (цяпер парк імя Жылібера) і гарадскога Дома культуры бібліятэкары цэнтральнай бібліятэкі правялі гутарку “Утварэнне СССР” і вусны часопіс “Па законах братэрства”.




На свяце да 60-годдзя ўтварэння СССР у Палацы хімікаў. Гутарку каля выставы праводзіць загадчык метадычнага аддзела ГЦБ Юдкіна Л.І. 1982 год.



**На свяце да 60-годдзя ўтварэння СССР у Палацы хімікаў выступаюць паэты Д.Бічэль, В.Іпатава, А.Цяжкі, К.Цвірка. 1982 год.**

Але самай вялікай падзеяй у жыцці гарадской цэнтральнай бібліятэкі стала свята кнігі “Зямля свабоды і герояў, Саюз рэспублік працоўных”. Свята было падрыхтавана бібліятэкай сумесна з членамі грамадскага аб’яднання аматараў кнігі. У Палацы хімікаў (цяпер Гродзенская абласная філармонія) адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя. Гучалі вершы і музыка савецкіх паэтаў і кампазітараў, дэманстраваліся хранікальна-дакументальныя стужкі пра 15 саюзных рэспублік. На свяце выступалі пісьменнікі: Д.Я.Бічэль-Загнетава, В.Іпатава, М.Дукса, А.Цяжкі, К.Цвірка. У фае Палаца была разгорнута выстава “Дружба народаў – дружба літаратур”.



**А.Я.Макаёнак – народны пісьменнік БССР (1920-1982)**

У красавіку **1983** года Савет Міністраў Беларускай ССР з мэтай увекавечання памяці пастанавіў прысвоіць імя вядомага беларускага драматурга, народнага пісьменніка БССР **Андрэя Ягоравіча Макаёнка** Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы.

У **1986** годзе былі адкрыты для жыхароў Прынёманскага мікраёна новыя філіялы №10 і №11 на вуліцы Пестрака. Цантральная бібліятэка імя А.Макаёнка ўзначаліла 13 гарадскіх бібліятэк-філіялаў.



Совет Министров Белорусской ССР

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

от 5 апреля 1983 г. № 109

г. Минск

ОБ УВЕКОВЕЧЕНИИ ПАМЯТИ А. Е. МАКАЕНКА

В целях увековечения памяти известного белорусского драматурга, народного писателя БССР Андрея Егоровича Макаенка Совет Министров Белорусской ССР постановляет:

1. Присвоить имя Андрея Егоровича Макаенка Гродненской центральной городской библиотеке и Журавичской средней школе Рогачевского района Гомельской области и впредь именовать их: Гродненская центральная городская библиотека имени А. Е. Макаенка, Журавичская средняя школа имени А. Е. Макаенка;

2. Поручить Минскому горисполкому:

присвоить имя А. Е. Макаенка одной из новых улиц г. Минска;

совместно с Союзом писателей БССР:

установить мемориальную доску на доме № 10 по Войсковому переулку в г. Минске, в котором жил А. Е. Макаенок;

установить в 1983 году на могиле А. Е. Макаенка надгробный памятник сметной стоимостью до 3,5 тыс. рублей.

Финансирование сооружения указанного памятника осуществляет Минский горисполком за счет доходов, дополнительно полученных при исполнении бюджета г. Минска.

3. Институту литературы имени Янки Купалы Академии наук БССР подготовить, а Государственному комитету БССР по делам издательств, полиграфии и книжной торговли издать в 1986—1990 годах собрание сочинений А. Е. Макаенка.

Председатель Совета Министров Белорусской ССР — А. Аксенов

Зам. Управляющего Делами Совета Министров Белорусской ССР — В. Лазаретов

12

Асноўныя статыстычныя паказчыкі працы бібліятэкі за **1978-1990**гг. - у табліцы і дыяграме:

| **Дынаміка колькасці чытачоў гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка (1978-1990гг.)** | | **Дынаміка колькасці кнігавыдачы гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка (1978-1990)** | |
|---|---|---|---|
| **Год** | **Чытачы** | **Год** | **Кнігавыдача** |
| 1978 | 6715 | 1978 | 162904 |
| 1979 | 6768 | 1979 | 165780 |
| 1980 | 6935 | 1980 | 165913 |
| 1981 | 7339 | 1981 | 171363 |
| 1982 | 7605 | 1982 | 183809 |
| 1983 | 7504 | 1983 | 179803 |
| 1984 | 7022 | 1984 | 170653 |
| 1985 | 7217 | 1985 | 183372 |
| 1986 | 7378 | 1986 | 181192 |
| 1987 | 7456 | 1987 | 141574 |
| 1988 | 7505 | 1988 | 155211 |
| 1989 | 7293 | 1989 | 168714 |
| 1990 | 7597 | 1990 | 150179 |
| **У сярэднім** | **7256** | **У сярэднім** | **167728** |



## Частка II. Неспакойнае ўчора (1987-2010)

У **1987** годзе дырэктарам цэнтральнай бібліятэкі і гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы з 14-ці бібліятэк стала **Галіна Іванаўна Рыбалка,** якая ў поўнай меры валодала талентам кіраўніка з сучасным падыходам да арганізацыі бібліятэчнай справы ў Гродна.

Хуткімі тэмпамі пачала ўмацоўвацца матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэк, з'явіліся новыя накірункі масава-інфармацыйнай работы з моладдзю. У **1989** годзе па вуліцы Ліможа быў адкрыты бібліятэчны пункт для абслугоўвання насельніцтва мікрараёна Дзевятоўка.

Добра і якасна фарміраваўся фонд бібліятэк. Лічбы камплектавання фонду ГЦБС **1987-1993** гадоў уражваюць, асабліва калі параўнаць іх з лічбамі другой паловы 90-х гадоў XX - пачаткам XXI стагоддзяў:

| Паказчыкі/ гады | Папаўненне фонду Гродзенскай ГЦБС (паступіла, экз.) | У тым ліку кніг, экз. |
|---|---|---|
| **1987** | 55206 | 35006 |
| **1988** | 47529 | 41007 |
| **1989** | 74998 | 39276 |
| **1990** | 48472 | 28498 |
| **1991** | 32952 | 18403 |
| **1992** | 33699 | 21641 |
| **1993** | 34238 | 27021 |
| **1994** | - | - |
| **1995** | 10504 | 7367 |
| **1996** | 12467 | 9113 |

Вялікая ўвага надавалася афармленню бібліятэк, клубнай рабоце, арганізацыі гарадскіх мерапрыемтваў для насельніцтва. Бібліятэка вяла масава-інфармацыйную работу з чытачамі, падпарадкуючы яе тэматычным цыклам, якія прадыктаваныя інтарэсамі карыстальнікаў, прыярытэтамі ў дзейнасці ўстаноў культуры і знамянальнымі датамі сусветнай культуры. Назвы цыклаў мерапрыемстваў адлюстроўваюць змест масавай работы бібліятэкі: “Беларусь мая сінявокая...” - выхаванне нацыянальнай годнасці, любові да роднага краю; “Гродна – мой горад” - прапаганда ведаў пра гісторыю і культуру роднага горада; “Сённяшнія праблемы чалавецтва” – выхаванне экалагічнай культуры, здаровага ладу жыцця; “Абуджэнне да духоўнага жыцця” – выхаванне духоўнасці і маральнасці; “Бібліятэка і сям'я” – маральна-этычнае выхаванне ў сям'і, захаванне правоў дзіцяці; “Літаратурны дыліжанс” – выхаванне культуры чытання і любові да літаратуры; “Бібліятэка – асяродак нацыянальных культур” – культурна-асветніцкая дзейнасць бібліятэкі сумесна з нацыянальна-культурнымі таварыствамі горада Гродна.

У **1997** годзе ў штаце гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка адбыліся змены згодна з увядзеннем новых Тыпавых штатаў ЦБС

Міністэрства культуры: у аддзеле абслугоўвання і інфармацыі з’явіўся сектар бібліяграфіі і інфармацыі, быў арганізаваны на базе метадычнага аддзела аддзел бібліятэчнага маркетынгу.

Каардынуючы работу з рознымі культурна-асветніцкімі ўстановамі, работнікі цэнтральнай бібліятэкі арганізоўвалі і праводзілі **гарадскія імпрэзы** для дарослых і дзяцей, прысвечаныя розным падзеям і датам, звязаныя з грамадскім, культурным і літаратурным жыццем Гродна. Усяго за перыяд з **1996** па **2000** год было праведзена **25** такіх мерапрыемстваў. Сярод іх асабліва вылучаюцца вечарыны памяці пісьменніка А.Карпюка, паэта А.Міцкевіча, мастака І.Пушкова, вечарыны ў гонар юбілеяў мастака У.Церабуна, паэта В.Кудлачова, прэзентацыя гісторыка-дакументальнай хронікі “Памяць Гродна” выдавецтва “БелЭн”.

Пры цэнтральнай бібліятэцы з **1994** года дзейнічаў клуб бібліятэчных работнікаў горада **“Бібліягасцёўня”**, які да **1997** года насіў назву “Беларусіка”. Клуб “Бібліягасцеўня” аб’ядноўваў бібліятэчных работнікаў гарадскіх і школьных бібліятэк, мэта яго стварэння – гэта павышэнне культурнага ўзроўню супрацоўнікаў праз знаемства з гістарыка-культурнымі каштоўнасцямі, вядомымі прадстаўнікамі культуры і мастацтва горада Гродна. За перыяд з **1996-2000** год члены “Бібліягасцёўні” **16** разоў сустракаліся з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі горада, **6** разоў наведвалі музеі і выстаўкі, тэатры і канцэртныя залы. Сустрэчы ў клубе “Бібіягасцёўня” адбываліся штоквартальна, арганізоўваў дзейнасць клубу спачатку метадычны аддзел, а з **1997** года - аддзел бібліятэчнага маркетынгу ЦБ.

У **1997** годзе быў зроблены першы крок на шляху камп’ютарызацыі бібліятэк: у цэнтральную бібліятэку пачалі набывацца камп’ютары. Камп’ютар “Pentium-1” з’явіўся ў аддзеле бібліятэчнага маркетынгу. На працягу **2000** года былі набыты яшчэ два камп’ютары: у аддзел камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду і ў аддзел абслугоўвання і інфармацыі.

У **1998** годзе прыкладна **28%** ад агульнага фінасавання ўстаноў культуры горада было выдзелена на рамонт гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаенка і рэканструкцыю цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі. Пасля рамонту бібліятэк для іх былі набыты новая мэбля, стэлажы, сталы чытальнай залы, кафедры.

З канца **1998** года ў гарадской цэнтральнай бібліятэцы было арганізавана абслугоўванне чытачоў на платнай аснове. З’явіліся дадатковыя платныя паслугі. За **1999** год было аказана платных паслуг на суму 97 500 000 дэнамінаваных рублёў. За **2000** год гэта сума складала 490 565 рублёў (пасля дэнамінацыі). Асабліва карысталася попытам такая паслуга, як выдача кніг, часопісаў і іншых друкаваных дакументаў з чытальнай залы на дом.

Са з’яўленнем новага маркетынгавага падыходу да бібліятэчнай дзейнасці і набыццём камп’ютараў актывізаваліся рэклама ў сродках масавай

інфармацыі, пачалі праводзіцца сацыялагічныя даследаванні. З **1998** года развіваецца выдавецкая дзейнасць. За перыяд з **1998** да **2000** года было выдадзена **19** выдавецкіх прац. Сярод іх асабліва вылучаецца рэкламна-інфармацыйны бюлетэнь "Бібліягасцёўня", перыядычнасць выхаду якога – 2 выпускі за год. Выдаваліся лістоўкі з абагульненнем цікавага вопыту работы бібліятэк сістэмы. Ствараліся рэкламныя буклеты для кожнага філіяла цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

У канцы **2000** года былі набыты спецыяльная бібліятэчная праграма для аўтаматызацыі працэсаў апрацоўкі літаратуры, стварэння электроннага каталога "Камплектаванне і апрацоўка літаратуры" і база даных нарматыўна-прававой дакументацыі "Юр-Эксперт". Першым ў Гродзенскай вобласці з **2001** года пачаў працаваць публічны цэнтр прававой інфармацыі пры бібліятэцы (не на базе ІПС "Эталон", а з дапамогай набытай БД "ЮрЭксперт"). З **2001** года быў аўтаматызаваны працэс камплектавання і апрацоўкі новых паступленняў.

З **1997** года пачаў дзейнічаць пры бібліятэцы **клуб аматараў раслін, кветак "Флора".** Ініцыятарам стварэння і душою дзейнасці клуба выступіла Нікалайчанка Э.С., якая арганізавала клуб, пачынаючы працу на пасадзе загадчыка аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

У **2000** годзе цэнтральная дзіцячая бібліятэка пераехала ў новае адрамантаванае памяшканне па вуліцы Цітова, 12. Умовы працы бібліятэкараў, абслугоўвання юных карыстальнікаў значна палепшыліся.

Па выніках **2001** года бібліятэка стала пераможцай абласнога конкурсу публічных бібліятэк **"Бібліятэка – інфармацыйны цэнтр рэгіёну".**

Гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма на чале з цэнтральнай бібліятэкай за выкананне планавых паказчыкаў і якасную арганізацыю абслугоўвання насельніцтва стала пераможцай абласнога конкурсу **"Лепшая ўстанова культуры 2003 года".**

Рашэннем Гродзенскага гарвыканкама №137 ад 9 сакавіка 2005 года "Аб выніках спаборніцтва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый горада "За дасягненне высокіх паказчыкаў у эканамічным і сацыяльна-культурным развіцці **ў 2004** годзе" гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма на чале з гарадской цэнтральнай бібліятэкай імя А.Макаёнка была вызначана пераможцай у намінацыі "Установа культуры". Бібліятэка атрымала **Ганаровы пераходны сцяг** Гродзенскага гарвыканкама і грашовую прэмію.

За **2005-2006** гады праведзена поўная аўтаматызацыя дзейнасці бібліятэкі па арганізацыі электроннага каталога і абслугоўванню чытачоў. У бібліятэцы дзейнічаюць **12** аўтаматызаваных рабочых месцаў, **9** з якіх уключаны ў лакальную сетку. Забяспечана работа 7-мі падсістэм АБІС: "Камплектаванне", "Апрацоўка", "Аналітыка", "Краязнаўства", "Рэгістрацыя чытачоў", "Абслугоўванне чытачоў", "Электронны каталог". Аўтаматызацыя і тэхнічнае пераўзбраенне бібліятэкі ўнеслі карэнныя змены ў традыцыйныя

бібліятэчныя тэхналогіі і дазволілі больш якасна абслугоўваць чытачоў.

У **2006** годзе аддзел камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду з памяшкання па вул. Камарова, 5 быў пераведзены ў новае адрамантаванае памяшканне па вуліцы Кляцкова, 104, што значна палепшыла ўмовы працы калектыву.

З **2008** года стаў працаваць духоўна-асветніцкі **клуб “Дзянніца”**, які аб’яднаў моладзь. У пасяджэннях клуба бяруць удзел свяшчэннікі Гродзенскай епархіі, выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. Члены клуба на сваіх пасяджэннях знаёмяцца з асновамі праваслаўнай культуры, духоўна-асветніцкімі выданнямі. Штогадова адбываецца **10-11** пасяджэнняў клуба. Ініцыятарам і кіраўніком клуба з’яўляецца гал. бібліятэкар Тарасава В.М.







У **2008** годзе ў склад гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы ўвайшоў яшчэ адзін **філіял №12** – спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку. Рашэннем Гродзенскага выканаўчага камітэта ад 20.12.2008 года № 850 бібліятэка ВЧУП “Фільтр” ГА “БелТІЗ” была перададзена аддзелу культуры Гродзенскага гарвыканкама і рэарганізавана ў філіял №12 Гродзенскай ГЦБС як спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку. Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка ўзначаліла **14** філіялаў.

З **2010** года дырэктарам Гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы і Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка прызначана **Камарова Марыя Аляксандраўна.** Камарова М.А. працуе ў ГЦБС з **1980** года. У перыяд **1986-2005** гады ўзначальвала дзіцячую бібліятэку-філіял №11, з **2005** да **2010** года займала пасаду намесніка дырэктара ГЦБС.



Дырэктар Гродзенскай ГЦБС Камарова М.А. (2010-...)

# Частка III. Цікавае сёння і фантастычнае заўтра (2011 – 2012)




Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка займае важнае месца ў сацыяльна-культурным развіцці грамадства. Яна ўзначальвае **14** бібліятэк-філіялаў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. З іх **6** дзіцячых, **6** бібліятэк-філіялаў для дарослага чытача і **2** спецыяльныя бібліятэкі-філіялы (для інвалідаў па зроку і польскай літаратуры).

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка з'яўляецца не толькі захавальніцай каля **127000** экземпляраў дакументаў, але і інфармацыйным і культурным цэнтрам у горадзе. Паслугамі бібліятэкі карыстаецца штогадова каля **8,5** тысяч чытачоў, ім выдаецца каля **185000** экзэмпляраў дакументаў. У склад бібліятэкі ўваходзяць аддзел апрацоўкі, камплектавання і арганізацыі адзінага фонду, аддзел бібліятэчнага маркетынгу; для чытачоў працуе аддзел абслугоўвання і інфармацыі, у які ўваходзяць абанемент, чытальная зала, інфармацыйна-бібліяграфічны сектар. У аддаленым ад цэнтра горада мікраённе Дзевятоўка працуе бібліятэчны пункт.




Сваю дзейнасць бібліятэка каардынуе з грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі, творчымі ўстановамі і саюзамі. Асабліва цеснае супрацоўніцтва ў бібліятэкі з Гродзенскім дзяржаўным музеем гісторыі рэлігіі, Гродзенскай епархіяй, Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем, Гродзенскім гарадскім домам культуры, Гродзенскім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў, нацыянальна-культурнымі таварыствамі яўрэяў і рускіх, сярэднімі школамі № 15 і №6, Гродзенскімі дзяржаўнымі гандлёвым і палітэхнічным каледжамі.

Свята беларускага пісьменства для насельніцтва праводзіцца ГЦБ імя А.Макаёнка штогадова ў верасні з 1994 года. Мерапрыемства носіць комплексны характар і мае насычаную праграму. Тут выступленні пісьменнікаў і тэатральныя замалёўкі, экспазіцыі з фондаў музеяў, песні і танцы… І абавязкова – сустрэча з Кнігай…







Для карыстальнікаў бібліятэкі распрацаваны праграмы масава-інфармацыйнай дзейнасці разам з грамадскімі арганізацыямі і творчымі саюзамі горада: "Абуджэнне да духоўнага жыцця" - па духоўнаму выхаванню, "Мой горад Гродна" - па краязнаўчай дзейнасці, "Мы і асаблівыя дзеці" – па рабоце з дзяцьмі-інвалідамі, "Зямля – наш агульны дом" – па экалогіі, “Нацыянальная мазаіка” – па супрацоўніцтву з нацыянальна-культурнымі грамадскімі аб’яднаннямі, “Здаровы лад жыцця” – па фарміраванню здаровага ладу жыцця і прафілактыцы ВІЧ/СНІД  і інш.




Штогадова праводзіцца каля 70-ці мерапрыемстваў, якія раскрываюць перад жыхарамі горада змест бібліятэчных фондаў, інфармуюць іх аб значных актуальных падзеях грамадскага жыцця, юбілейных датах, садзейнічаюць адраджэнню і захаванню нацыянальнай культуры, зберажэнню гісторыка-культурнай

спадчыны. Сярод іх гарадское свята да Дня беларускага пісьменства "Наш духоўны скарб", свята дзіцячай і юнацкай кнігі для школьнікаў горада "Падарожжа ў Кнігаград", святочныя вечарыны “Залаты ўзрост” і “Аб матулі – з пяшчотай і любоўю” - да Дня пажылога чалавека і Дня Маці, дні інфармацыі па выхаванню здаровага ладу жыцця, вечарыны да юбілеяў і значных дат у жыцці яўрэйскага народа ў абшчынным доме “Менора” (грамадскае аб’яднанне яўрэяў), прэзентацыі кніг гродзенскіх пісьменнікаў, выязныя выставы да юбілейных дат.



Клуб аматараў раслін “Флора” на пасяджэннях у чытальнай зале



Плённа працуе пры бібліятэцы клуб **“Флора”**, прызначаны арганізаваць вольны час аматараў дачных участкаў, прысядзібнага дызайну, даць парады па развядзенню садоў і кветнікаў. Штогадова праводзіцца **10-12** мерапрыемстваў клуба, у якіх бяруць удзел навуковыя супрацоўнікі кафедры батанікі і фізіялогіі раслін Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага універсітэта. У **2012** годзе клубаўцы ўрачыста адзначылі свай 15-гадовы юбілей.

Пасяджэнні “Флоры” адбываюцца ў форме святочных вячорак, практычных заняткаў, выязных экскурсій па абмену вопытам вядзення прысядзібнай гаспадаркі на дачы членаў клуба, сустрэч з цікавымі людзьмі. Тэмы мерапрыемстваў: “Вырошчваем лілеі!”, “Аканіт – небяспечнае хараство”, “Прымулы – ключыкі вясны”, “Сімфонія колеру, або Дрэс-код для цюльпана”, ”Мінімальны клопат – з ружамі гэта магчыма!”, “Вырошчваем касачы – рызыкуем асцярожна!”, “Мяцельчатая гартэнзія просіцца ў нашы сады”, “Дэкаратыўныя кустарнікі для маленькага саду”, “Памылкі ў ландшафтным дызайне, “Навагодняя фальклярыстыка”, “Дзівосны свет архідэй” і іншыя.

Цікавымі і змястоўнымі з’яўляюцца мерапрыемствы духоўна-асветніцкага клуба для моладзі **“Дзянніца”,** які быў арганізаваны пры бібліятэцы ў **2008** годзе.

У мерапрыемствах клуба бяруць удзел навукоўцы Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я.Купалы, свяшчэннікі Гродзенскай епархіі. Тэматыка сустрэч: “Праваслаўная кніга – наш сябр і настаўнік”, “Духоўнае кіраванне сучасніка”, “Вобразы святынь Гродзенскай зямлі ў творчасці

беларускіх пісьменнікаў”, “Прырода канфліктаў і іх пераадоленне”, “Сям’я – яднанне і любоў” і інш.




Вядзецца работа па захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, у якой значнае месца адводзіцца краязнаўчай дзейнасці. Ствараецца летапіс дзейнасці бібліятэкі. Збіраюцца гісторыка-дакументальныя матэрыялы пра знакамітых гараджан, якія сваёй творчай дзейнасцю ўнеслі значны ўклад у развіццё культуры Гродна. Сабраны і афармлены матэрыялы пра заслужаных дзеячоў культуры А.К.Шыдлоўскага, А.С.Чопчыца, Л.Д.Ляшэнка, самадзейнага кампазітара Я.К.Петрашэвіча, паэта Юрку Голуба, дзіцячага паэта В.С.Кудлачова, мастака У.В. Церабуна і інш.

Аб’ём электроннага каталога ў **2012** годзе склаў больш за **140** тыс. запісаў. З дапамогай пошуку ў інфармацыйных рэсурсах іншых бібліятэк праз сетку Інтэрнэт у ГЦБ імя А.Макаёнка выконваецца больш за **1** тыс. даведак, або **41%** ад агульнай колькасці. З дапамогай электроннага каталога выконваецца **89%** адрасных і тэматычных бібліяграфічных даведак.

Пашырыць інфармацыйныя магчымасці бібліятэкі дапамагае створаны на яе базе публічны цэнтр прававой інфармацыі. Яго фонд складаецца з друкаваных дакументаў і інфармацыйна-пошукавай сістэмы “Эталон” Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Колькасць выдадзеных дакументаў прававой тэматыкі за год перавышае **5000** экзэмпляраў. Наладжана штомесячнае бясплатнае юрыдычнае кансультаванне карыстальнікаў у бібліятэцы.

Кожны год фонд бібліятэкі папаўняюцца **1600** экзэмплярамі новых кніг, **50** экзэмплярамі электронных выданняў. Выпісваецца больш за **130** назваў перыядычных выданняў.

У мэтах больш якаснага абслугоўвання чытачоў уведзены і дзейнічаюць дадатковыя платныя паслугі: выдача выданняў дадому з чытальных залаў,

ксеракапіраванне, сканіраванне, ламініраванне, выдача кніг камерцыйнага фонду і іншыя. За **2011** год бібліятэка атрымала ад пазабюджэтнай дзейнасці больш за **71** млн.руб, за **2012** год – больш за **100** млн. руб.

Бібліятэка з'яўляецца метадычным цэнтрам для **14** гарадскіх бібліятэк-філіялаў, для бібліятэк **38**-мі сярэдніх школ і **18**-ці бібліятэк сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Яна праводзіць семінары і круглыя сталы, заняткі школы прафесійнага майстэрства, абагульняе і ўкараняе інавацыі, аказвае метадычную і практычную дапамогу, займаецца выдавецкай дзейнасцю.







Калектывам бібліятэкі штогадова выдаецца больш за **25** творчых прац, сярод якіх рэкламна-інфармацыйны бюлетэнь "Бібліятэчны калейдаскоп", зборнікі метадычных і сцэнарных матэрыялаў у дапамогу бібліятэкару, бібліяграфічныя паказальнікі і спісы.







Асабліва плённа на ніве складальніцкай бібліяграфічнай дзейнасці працуе інфармацыйна-бібліяграфічны сектар ГЦБ. Выданні падрыхтаваны з улікам усіх методыка-бібліяграфічных патрабаванняў, бібліяграфічныя дапаможнікі маюць добры даведачны апарат. Сярод выданняў **2011-2012** года:

| | |
|---|---|
| *Нашчадкам слова застанецца: да Дня беларускага пісьменства і друку: бібліяграфічны паказальнік літаратуры / уклад. Н.С. Аўчыннік; рэд. І.М. Ілюшына. - Гродна, 2011. - 85 с.* | *Радкі пра Гродна: вершы і проза пра Гродна на старонках друку бібліяграфічны паказальнік літаратуры /уклад. І.М. Ілюшына; рэд. Д.У. Крачко.- 2-е выд., дапрац. і дапоўн.- Гродна, 2012.- 62 с.* |
| *Чарнобыль – катастрофа стагоддзя: бібліяграфічны паказальнік літаратуры / уклад. Д. У. Крачко; рэд. І.М. Ілюшына. - Гродна, 2011. - 30 с.* | *Святы шчырага сэрца: бібліяграфічны паказальнік літаратуры / уклад. І.М.Ілюшына.- Гродна, 2012.- 49с.* |
| *Сямейная прававая азбука: бібліяграфічны паказальнік літаратуры / уклад. І.М. Ілюшына; рэд. Д. У. Крачко. - Гродна, 2011. - 38 с.* | *Якуб Колас: партрэт на фоне эпохі: бібліяграфічны паказальнік літаратуры да 130-годдзя Якуба Коласа / уклад. Д.У.Крачко.- Гродна, 2012.- 52с.* |
| *Суквецце нацый, карагод сяброў: бібліяграфічны паказальнік літаратуры / уклад. І.М.Ілюшына; рэд. Д.У. Крачко. - Гродна, 2011. - 46 с.* | *"Лёс народа – Купала": бібліяграфічны паказальнік літаратуры да 130-годдзя паэта Янкі Купалы / уклад. Д.У.Крачко.- Гродна, 2012.- 40с.* |
| *Максім Багдановіч: старонкі лёсу і творчасці: бібліяграфічны спіс літаратуры да 120-годдзя паэта / уклад. Д. У. Крачко; рэд. І. М. Ілюшына. - Гродна, 2011. - 8с.* | *Час і постаць Максіма Танка: бібліяграфічны паказальнік літаратуры да 100-годдзя паэта / уклад. Д.У.Крачко.- Гродна, 2012.- 24с.* |



Адным з галоўных накірункаў дзейнасці бібліятэкі з’яўляецца даследчая работа. Праведзены сацыялагічныя даследаванні, такія як “Інтарэсы чытачоў пенсіённага ўзросту і ступень іх задавальнення бібліятэкай”; “Абслугоўванне карыстальнікаў прававой інфармацыяй ва ўмовах публічнай бібліятэкі”; “Інфармацыйныя патрэбнасці падлеткаў у прававой літаратуры”, “Бібліятэка ці медыятэка?”, “Сацыяльна-значная літаратура ў фондах ГЦБС г.Гродна: праблемы камплектавання і выкарыстання”, “Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі і даведачна бібліяграфічнае абслугоўванне ў перыяд аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў” і іншыя.




У **2011** годзе цэнтральная бібліятэка арганізавала работу бібліятэк-філіялаў гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы на актыўны ўдзел у абласной акцыі **“Чытаем беларускую кнігу!”,** якую прапанавала публічным бібліятэкам Гродзеншчыны абласная навуковая бібліятэка імя Я.Карскага. Была праведзена паэтапная работа кожнай бібліятэкі з мэтай канцэнтрацыі грамадскай увагі, асабліва ўвагі падрастаючага пакалення, на навінках беларускай кнігі, творчасці айчынных пісьменнікаў. Пры гэтым, работа вялася ў цесным супрацоўніцтве з сярэднімі школамі і спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі. У рэалізацыі праграмы мерапрыемстваў акцыі бралі ўдзел **21** навучальная ўстанова горада і Гродзенскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Усяго за **2011** год бібліятэкамі было праведзена **71** мерапрыемства па прапагандзе беларускай кнігі і арганізавана **65** выстаў, прысвечаных выданням і знакамітым пісьменнікам і паэтам Беларусі. Было выдадзена **21** выданне, сярод якіх бібліяграфічныя спісы, паказальнікі, біябібліяграфічныя спісы, метадычныя дапаможнікі, лістоўкі, закладкі, буклеты. Супрацоўнікамі да мерапрыемстваў было распрацавана **14** мультымедыйных прэзентацый, прысвечаных лепшым выданням і серыям беларускай літаратуры, творчасці вядомых пісьменнікаў, творам і жанрам беларускай літаратуры.

Па выніках абласной акцыі “Чытаем беларускую кнігу!” ГЦБС не атрымала прызавога месца. Матэрыял пад назвай **“Беларуская кніга ў прасторы бібліятэкі”** быў накіраваны для ўдзелу у XX Рэспубліканскім конкурсе Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры” у намінацыі “За значны ўклад у выхаваўчую работу

з падрастаючым пакаленнем”. Да ўдзелу ў дадзеным конкурсе ў намінацыі “Інавацыйная дзейнасць” быў прадстаўлены матэрыял **“Бібліятэка – тэрыторыя талерантнасці”**.




Праца гарадскіх бібліятэк Гродна ў **2011** годзе была высока ацэнена журы Рэспубліканскага конкурсу. Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма стала **пераможцай Рэспубліканскага конкурсу “Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры”** ў намінацыі “За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем” і атрымала Другую прэмію конкурсу сярод гарадскіх бібліятэк рэспублікі.

Дзейнасць аддзела камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду ГЦБ імя А.Макаёнка і калектыва ГЦБС па папаўненні фонду сацыяльна-значнымі выданнямі дзяржаўных выдавецтваў была таксама высока ацэнена на ўзроўні рэспублікі. Гродзенская ГЦБС атрымала **Дыплом Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь** за актыўнае камплектаванне сацыяльна-значнай літаратурай у 2011 годзе, які быў урачыста ўручаны дырэктару падчас семінару ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.




У **2011** годзе завяршыліся рэканструкцыя і рамонт новага памяшкання спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку на першым паверсе будынку ВЧУП “Фільтр” ГА “БелТІЗ”. 23 снежня **2011** года адбылося ўрачыстае адкрыццё бібліятэкі ў новым памяшканні.



**Урачыстае адкрыццё філіяла №12 – спецыяльнай бібліятэкі для інвалідаў па зроку ў новым памяшканні (2011)**

У **філіяле №12** створаны 2 АРМ для інвалідаў па зроку, падключаны Інтэрнэт. Пачаў работу Публічны цэнтр прававой інфармацыі (ПЦПІ) для насельніцтва мікрараёна Дзевятоўка (устаноўлена ІПС “Эталон” НЦПІ). Для карыстання агучанай літаратурай на магнітафонных стужках ёсць 2 музычныя цэнтры. Устаноўлена спецыяльнае праграмнае забеспячэнне (праграма экраннага доступу JAWS) у дапамогу невідушчым, якое агучвае ўсе працэсы карыстання камп’ютарам. Закуплена тыфлаабсталяванне: электронная лупа (павелічэнне любога тэксту ці малюнку ў 32 разы) і дэйзі-плэер (Daisyplaer для агучвання тэкстаў).






У **2013** годзе цэнтральная бібліятэка пераходзіць на новы праграмны прадукт АБІС “Alis-Web” для больш якаснай арганізацыі аўтаматызаванага абслугоўвання карыстальнікаў, вядзення і выкарыстання электроннага каталога. АБІС заснавана на Беларускім камунікатыўным фармаце прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у машыначытаемай форме Belmarc. Неабходна абнаўленне камп’ютарнага парку, таму што трэцяя частка машын сістэмы бібліятэк мае ўзрост 10 гадоў і больш, іх выкарыстанне для аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў ужо немагчыма. Паўстала вострая неабходнасць з’яўлення сектара аўтаматызацыі і інфармацыйных тэхналогій са спецыялістамі – загадчык сектара, інжынер-праграміст, інжынер па абслугоўванню камп’ютарнай і множыльнай тэхнікі, адміністратар баз даных і сайта. У канцы **2012** года ў штатным раскладзе ГЦБ з’явіўся нарэшце сектар аўтаматызацыі і інфармацыйных тэхналогій.

Новы накірунак у **2012** годзе набыла краязнаўчая дзейнасць. Быў распрацаваны праект **краязнаўчай электроннай бібліятэкі “Гродна – інфармацыя для ўсіх” (ЭБ).** Праектам прадугледжана стварэнне масіва краязнаўчых электронных інфармацыйных рэсурсаў на аснове карпаратыўнага ўзаемадзеяння бібліятэк Гродзенскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы з прадастаўленнем магчымасці доступу да іх лакальных карыстальнікаў, а ў перспектыве і аддаленых карыстальнікаў.




Сабраны пачатковы рабочы матэрыял для ЭБ, пачалася распрацоўка праграмнага прадукту студэнтамі 5-га курса факультэта матэматыкі і інфарматыкі ГрДУ імя Янкі Купалы. Стварэнне праграмы сучаснай лічбавай бібліятэкі “Гродна – інфармацыя для ўсіх” была зацверджана як дыпломны праект выпускнікоў універсітэта, будучых праграмістаў.

У **2011-2012** гадах выдадзены **краязнаўчыя бібліяграфічныя даведнікі,** якія прысвечаны гісторыка-культурным каштоўнасцям горада Гродна:




Гісторыка-культурныя помнікі Гродна: бібліяграфічны даведнік / Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка; уклад. А.Б.Сяўрук; рэд. Н.Ю.Баброва, Д.У.Крачко, І.М.Ілюшына.- Гродна, 2011.- 76с.

Гісторыка-культурныя помнікі Гродна: страчаная спадчына: бібліяграфічны даведнік / Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка; уклад. Сяўрук А.Б., рэд. І.М.Ілюшына, Н.Ю.Баброва.- Гродна, 2012.- 28с.

Дзейнасць Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка непарыўна звязана з лёсам Беларусі, яе народа. Галоўнае багацце бібліятэкі – гэта людзі. Дзякуючы ім яна дасягнула цяперашніх здабыткаў. На сённяшні дзень калектыў бібліятэкі – гэта **23** спецыялісты-бібліятэкары, якія самааддана і творча падыходзяць да арганізацыі абслугоўвання карыстальнікаў і масава-інфармацыйнай дзейнасці.

Актуальным на сённяшні дзень для калектыва з’яўляецца вырашэнне задачы паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы культуры, наданне сучаснага эстэтычнага аблічча галоўнай агульнадаступнай бібліятэцы горада.  Калі немагчыма пабудаваць па спецыяльным праекце дастойную гродзенцаў гарадскую цэнтральную бібліятэку, то нарэшце неабходны капітальны і бягучы рамонты існуючых будынка і памяшканняў, пашырэнне плошчы для захавання фонду за кошт памяшканняў-дэпазітарыяў, пошук дадатковых памяшканняў для абслугоўвання чытачоў, арганізацыі вольнага часу насельніцтва, медыязоны, зоны свабоднага карыстання фондам, чытання і адпачынку, даведачна-бібліяграфічнай работы, а таксама асобнага памяшкання для мерапрыемстваў - канферэнц-залы ці літаратурнай гасцёўні.

Добрым варыянтам вырашэння праблемы памяшканняў можа быць выкарыстанне існуючых побач будынкаў, напрыклад, кінатэатра імя А.С.Пушкіна, дзе знаходзіцца сёння бар, ці пашырэнне плошчы за кошт існуючага ў доме жылога фонду. Галоўнае, гэта разуменне ісціны, што такое аблічча цэнтральная бібліятэка горада мець не можа, не хоча і не павінна.

# Частка IV. Гісторыя бібліятэкі ў асобах

У гісторыі гарадской бібліятэкі першых дзесяцігоддзяў назіраецца пастаянная змена кадраў, за мільганнем прозвішчаў бібліятэкараў у архіўных дакументах нават цяжка прасачыць. Многія працавалі год, два, тры, затым выходзілі замуж, параязджалі ў іншыя гарады і краіны, альбо пераходзілі працаваць у філіялы ЦБС, іншыя бібліятэкі горада.

Прыкметны след у гісторыі бібліятэкі пакінулі яе кіраўнікі. Пра першых кіраўнікоў бібліятэкі, на жаль, звестак вельмі мала. Яны ўвесь час мяняліся. Але ёсць сярод іх асобы, якія пакінулі заўважны след у гісторыі ўстановы. Перш за ўсё, гэта **Барэль Марыя Іванаўна**, якая была загадчыкам гарадской бібліятэкі з 1962 да 1971 года, **Бушнева Аляксандра Аляксандраўна,** якая стала загадчыкам гарадской бібліятэкі ў **1974** годзе, затым дырэктарам гарадской ЦБС (снежань **1975 –** сакавік **1987)**. З **1987** года **Рыбалка Галіна Іванаўна** ўзначаліла гарадскую ЦБС і працавала на карысць бібліятэчнай справы на пасадзе дырэктара да **2009** года. З **2010** года дырэктарам ГЦБС г.Гродна была прызначана **Камарова Марыя Аляксандраўна**, якая працуе ў гарадской ЦБС з 1980 года, узначальвала калектыў дзіцячага філіяла №11, а з 2005 года была намеснікам дырэктара ГЦБС.

У **1976** годзе на абанемент гарадской цэнтральнай бібліятэкі прыйшлі працаваць **Абрамовіч Канкордзія Паўлаўна** і **Савіцкая Ганна Іванаўна**, а праз год да іх далучылася **Чачун Галіна Пятроўна**. Ва ўсёй гісторыі бібліятэкі праца гэтых людзей - адзіны прыклад пастаянства, вернасці і адданасці сваёй бібліятэцы. Больш за 35 гадоў яны з’яўляліся і з’яўляюцца прапагандыстамі кнігі, якія назіралі за чытаннем не аднаго пакалення чытачоў, не здраджвалі рабоце па абслугоўванню чытача ніколі. Для іх праца ў гарадской цэнтральнай бібліятэцы па вуліцы Савецкіх Пагранічнікаў стала прызваннем і лёсам.




Мальцава Л.В. – заг. перасоўнага фонду ГЦБ (1973-1975), заг. дзіцячай бібліятэкі-філіяла №7 (1975-1985), гал. метадыст (1987-1989), заг. арганізацыйна-метадычнага аддзела ГЦБ імя А.Макаёнка (1989-1993), намеснік, а затым дырэктар ГАНБ імя Я.Карскага (1993- ц.ч.)

На працягу многіх гадоў у бібліятэцы працавалі і працуюць кваліфікаваныя, улюблёныя ў сваю справу людзі. Гэта іх самаадданай і бескарыснай працай пішацца летапіс гарадской цэнтральнай бібліятэкі.

Сярод тых, хто пакінуў свой след шматгадовай добрасумленнай працай у

рабоце ўстановы **Луцэвіч В.А., Петрушанская В.М., Туравец А.В., Машалас Л.А., Гулідава В.І., Купрыкава Г.А., Юдкіна Л.І., Падкуйка Л.М., Мальцава Л.В., Бандарчук А.У.**

Прыйшоўшы аднойчы ў гарадскую бібліятэку, засталіся ёй вернымі і працуюць па сённяшні дзень **Ілюшына І.М., Макавеева С.С., Грамыхова Л.І., Адаміна Л.У., Сяўрук А.Б., Нікалайчанка Э.С., Крачко Д.У., Баброва Н.Ю., Свірыда Н.Р.**



**Падкуйка Л.М. – намеснік дырэктара ГЦБС па рабоце з дзецьмі, загадчык цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі (1985-1999), намеснік дырэктара ГЦБС (1999-2005), заг. аддзела матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння (2005-2007 гг.)**

Многа добрых слоў і шчырую падзяку калектыў ГЦБС можа выказаць у адрас **Падкуйка Лідзіі Мікалаеўны.** Яна нарадзілася **5 сакавіка 1939** года ў пасёлку Навагеоргіеўка Адэскай вобласці (УССР) у сям'і служачых. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў **1956** годзе паступіла ў культурна-асветніцкі тэхнікум горада Белгарад-Днястроўскі Адэскай вобласці, які скончыла ў **1958** годзе. Працоўную дзейнасць пачала з пасады бібліятэкара Звенігародскага раённага аддзела культуры Чаркасскай вобласці (УССР), дзе працавала з **1958** да **1960** гады. З **1961** да **1964** была загадчыкам перасоўнага кніжнага фонду Ульянаўскага абкама прафсаюзаў, з **1965** да **1967** загадвала бібліятэкай Крыварожскага завода будматэрыялаў.

У **1969** годзе скончыла Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры па спецыяльнасці бібліятэкар-бібліёграф. Пасля заканчэння інстытуту працавала з **1970** да **1981** года ў бібліятэках вайскавых частак Расіі. У **1981** годзе пераязджае разам з мужам, ваеннаслужачым, у Беларускую ССР. Працуе да **1984** года інструктарам па рабоце з сем'ямі ваеннаслужачых Лепельскага гарнізоннага Дома афіцэраў. У **1984** годзе пераязджае ў Гродна, дзе прыходзіць з мэтай уладкавання на бібліятэчную працу да дырэктара Гродзенскай ГЦБС Бушневай А.А.

З верасня **1984** года Падкуйка Л.М. уладкоўваецца на пасаду загадчыка аддзела абслугоўвання гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка, з 16 жніўня **1985** года была пераведзена на пасаду намесніка дырэктара ГЦБС (па дзіцячаму чытачу) і адначасова стала загадчыкам цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі.

Л.М.Падкуйка праявіла сябе як энтузіяст бібліятэчнай справы, адданы сваёй працы і людзям чалавек, які з аптымізмам і ўпартасцю дасягае пастаўленай мэты. Як кіраўнік дзіцячай бібліятэкі, яна паспяхова арганізоўвала абслугоўванне школьнікаў мікрараёна, у тым ліку, цікавыя па форме і зместу мерапрыемствы – сямейныя святы, дыскусіі, чытацкія канферэнцыі, вечарыны. Але асабліва ёй удаваліся справы гаспадарчыя, якія

даводзілася выконваць пастаянна як намесніку дырэктара. Загадчыкам філіялаў запомніліся яе клапатлівасць, дбайнасць пра іх матэрыяльна-тэхнічную базу. Немалымі намаганнямі Лідзіі Мікалаеўны для правядзення мерапрыемстваў бібліятэк дабываліся фінансавыя сродкі шляхам фандрэйзінгу (гэты сучасны тэрмін поўнасцю адпавядае значнай частцы дзейнасці Падкуйка Л.М., хоць у перыяд яе работы ніхто з бібліятэк вобласці яго не выкарыстоўваў).

З **2005** года Л.М.Падкуйка ўзначальвала аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, дзе да звальнення ў **2007** годзе самааддана займалася гаспадарчай дзейнасцю бібліятэчных устаноў.

Калектыў бібліятэкі імя А.Макаёнка жыве з упэўненасцю, што прыйдуць лепшыя часы, у XXI стагоддзі будуць мець магчымасць працаваць у сусветнай інфармацыйнай прасторы, рабочыя месцы нашчадкаў бібліятэкараў будуць знаходзіцца ў пабудаваным па спецыяльным праекце будынку, які з годнасцю насіў бы назву “Гродзенская гарадская цэнтральная медыятэка імя А.Макаёнка”.



**Агульны сход калектыву ГЦБ імя А.Макаёнка (2012 год)**

## Дадатак №1. Біяграфіі кіраўнікоў



### Барэль Марыя Іванаўна (1932 ? – 1971), загадчык абанемента (1957-1962), загадчык Гродзенскай гарадской бібліятэкі (1962-1971)

**Барэль Марыя Іванаўна** працавала на пасадзе загадчыка абанемента з **1957** года, з **1962** да **1971** года была загадчыкам Гродзенскай гарадской бібліятэкі. Раптоўна памерла ў **1971** годзе. Пахавана ў г.Гродна на могілках па вул. Антонава.

Барэль М.І. мела вышэйшую спецыяльную адукацыю, скончыла бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута.

М.І.Барэль садзейнічала ўкараненню сучасных форм работы па прапагандзе кнігі і чытання, стала арганізатарам усіх цікавых пачынанняў па кіраўніцтву чытаннем рабочых прамысловых прадпрыемстваў горада.

20 красавіка **1959** года гарадская бібліятэка адна з першых бібліятэк Гродзенскай вобласці перайшла да арганізацыі свабоднага доступу да кніжнага фонду на абанеменце. Арганізацыяй новай формы раскрыцця кніжнага фонду абанемента займалася непасрэдна загадчык абанемента Марыя Іванаўна Барэль. У справаздачы бібліятэкі за **1959** год зазначана, што свабодны доступ даў значны прырост колькасці кнігавыдач бібліятэкі, асабліва актыўна пачала выдавацца галіновая літаратура. Павялічылася абарачальнасць кніжнага фонду.

Барэль М.І. актыўна арганізоўвала апытанні рабочых з мэтаю выяўлення іх інтарэсаў, складала для іх індывідуальныя планы чытання. Па складзеных ёю планах чыталі больш за **150** чалавек.

13 красавіка **1962** года **Барэль Марыя Іванаўна** стала загадчыкам бібліятэкі. За перыяд працы Барэль М.І. на пасадзе загадчыка ўстанова дасягнула значных поспехаў у рабоце.

У **1963** годзе гарадская бібліятэка пад яе кіраўніцтвам змагалася за **званне “Бібліятэка выдатнай працы”.** Праца па абслугоўванню чытачоў вялася ў напружаным рытме – без выхадных дзён, з 11 да 21 гадзіны.

Пастановай Савета упраўлення культуры Гродзенскага прамысловага аблвыканкама і прэзідыума абкома прафсаюзаў работнікаў культуры ад 26 сакавіка **1964** года Гродзенская гарадская бібліятэка атрымлівае ганаровае званне “Бібліятэка выдатнай працы” па выніках працы за **1963** год.

**1964-1968** гады пад кіраўніцтвам М.І.Барэль прайшлі для бібліятэкі ў творчай напружанай працы па абслугоўванню чытачоў, папаўненні кніжнага

фонду, прапагандзе кнігі і чытання. У **1964** годзе былі адкрыты перасоўныя аддзелы на **18** прадпрыемствах горада: велазаводзе, мэблевай фабрыцы, тыпаграфіі, лесагандлёвай базе, сілікатным заводзе і інш. Колькасць чытачоў у **1964** годзе дасягнула **5393** чалавек, ім было выдадзена **77259** дакументаў з кніжнага фонду аб'ёмам **53475** экземпляраў. У перыяд **1965-1968** гг. у бібліятэку запісваліся каля **5,5** тысяч чалавек, кнігавыдача складала каля **93000** экземпляраў, набывалася каля **4000** экземпляраў новых кніг штогадова. Колькасць масавых мерапрыемстваў, праводзімых за год, таксама ўражвае - **250**! Дзейнічала **15** бібліятэк-перасовак.

**1968** год асабліва вылучаецца актывізацыяй работы па заахвочванню чытачоў, рэкламе бібліятэкі, калі казаць сучаснай моваю. У гадавой справаздачы Барэль Марыі Іванаўны адзначана: ***"У 1968 годзе бібліятэка праводзіла вялікую работу па заахвочванню чытачоў. Вывешваліся аб'явы пра месцазнаходжанне і гадзіны працы бібліятэкі там, дзе збіраецца многа народу, на прадпрыемствах, у інтэрнатах, магазінах, ашчадных касах, аддзяленнях сувязі. Выступалі з інфармацыяй пра работу бібліятэкі па завадскім радыё, на камсамольскіх сходах, на вытворчых нарадах прадпрыемстваў. Расказвалі пра кніжны фонд, новыя паступленні літаратуры, часопісах, якія выпісвае бібліятэка. Трэба сказаць, што такая форма прапаганды бібліятэкі вельмі эфектыўная. Пасля такой інфармацыі паток чытачоў павялічваўся. У мэтах прыцягнення ў лік чытачоў усіх працуючых на прадпрыемствах, мы практыкавалі абходы па цахах на замацаваных за бібліятэкай прадпрыемствах з мэтаю давядзення кнігі да кожнага працуючага. У гутарцы з кожным рабочым высвятлялі, у якой бібліятэцы ён чытае, ці мае сваю хатнюю бібліятэку, чым цікавіцца, які ў яго разрад, ці вучыцца ён, ці плануе павышаць сваю кваліфікацыю, якая літаратура яму для гэтага патрэбна.***

***Каб наблізіць кнігі да працоўнага месца рабочага на тых прадпрыемствах, дзе няма сваёй бібліятэкі, былі адкрыты бібліятэкі-перасоўкі. Гэта шклозавод, Гандльмаш, хлебакамбінат, піўзавод, фабрыка афсетнага друку і інш. У мэтах прыцягнення рабочых да чытання вывешваліся аб'явы такога зместу: "Чытач! Ці з'яўляецца твой сябра чытачом бібліятэкі? Побач з табой не павінна быць нечытаючых!"***

Змест рэкламнай дзейнасці бібліятэкі 60-х гадоў XX стагоддзя, які паўстае з дакументу, можа стаць кіраўніцтвам у арганізацыі гэтай работы ў пачатку XXI стагоддзя.

Актыўная прапаганда бібліятэкі і чытання прынесла свой плён. У **1969** годзе колькасць чытачоў складала ўжо **6207.** Кнігавыдача **112880** таксама выклікае павагу, таму што сведчыць аб стабільнасці ў дзейнасці ўстановы на працягу 40 гадоў, да пачатку XXI стагоддзя.




Барэль М.І. была таленавітым кіраўніком, адукаваным і творчым чалавекам, адданым бібліятэчнай справе. Памяць аб кіраўніку гарадской бібліятэкі Барэль М.І. ушаноўваецца і сёння. Работнікі бібліятэкі наведваюць яе магілу (могілкі па вул. Антонава).



## **Бушнева (Міхасёнак) Аляксандра Аляксандраўна (1930-2008),**

**загадчык гарадской цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі (1971-1973), загадчык Гродзенскай гарадской бібліятэкі (1974), дырэктар Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі і ГЦБС (1975-1987)**

**Бушнева А.А.** нарадзілася 10 мая **1930** года ў вёсцы Чырвонае Асвейскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачых. У **1941** годзе сям'я была эвакуіравана ў Тамбоўскую вобласць (вёска Васільева Пачаеўскага раёна). У **1945** годзе сям'я вярнулася ў Беларусь. У **1948** годзе Бушнева А.А. скончыла сярэднюю школу горада Бешанковічы Віцебскай вобласці. У **1949** годзе разам з сям'ёй праехала ў г.Паставы. У **1953** годзе скончыла бібліятэчны факультэт Мінскага педагагічны інстытута. Працавала загадчыкам Пастаўскай гарадской бібліятэкі **(1953-1955гг.)** загадчыкам бібліятэкі Пастаўскага райкама партыі **(1955-1956гг.)**, бібліятэкарам Пастаўскай раённай бібліятэкі **(1956-1957гг.)**. З **1958** да **1961** года жыла па месцы службы мужа ў ГДР, дзе працавала бібліятэкарам вайсковых частак. Пасля заўчаснай смерці мужа ў **1962** годзе вярнулася у Паставы Віцебскай вобласці, дзе працавала загадчыкам раённай біблітэкі да **1964** года. У **1963** годзе другі раз выйшла замуж пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў Гродна, дзе сям'я з 4-х чалавек (Бушнева А.А. мела трох дзяцей) атрымала кватэру. З **1964** па **1968** гады працавала загадчыкам чытальнай залы бібліятэкі Гарадскога Дома афіцэраў, затым з **1968** да **1971** – старшым бібліёграфам Гродзенскай абласной дзіцячай бібліятэкі.

З 1 красавіка **1971** года Бушнева А.А. працуе загадчыкам дзіцячай цэнтральнай бібліятэкі па вул. Цітова, 13, у кастрычніку **1974** года яна прызначана загадчыкам гарадской бібліятэкі. Пасля цэнтралізацыі масавых бібліятэк стала дырэктарам гарадской ЦБС (снежань **1975 –** сакавік **1987)**.

Пасля выхаду на пенсію ў **1987** годзе Бушнева А.А. прадаўжала працу ў розных структурных падраздзяленнях гарадской бібліятэчнай сістэмы да **1996** года. Амаль 43 гады яна аддала бібліятэчнай справе, з іх 25 гадоў працавала ў Гродзенскай ГЦБС **(1971-1996)**.

Вялікая арганізацыйная праца Бушневай А.А. была праведзена падчас цэнтралізацыі сістэмы масавых гарадскіх бібліятэк Гродна. Сістэматычны каталог на фонд 4-х бібліятэк быў створаны ў рэкордныя тэрміны – да чэрвеня **1976** года. У ліпені зводны сістэматычны каталог быў правераны і адобраны спецыяльнай камісіяй Міністэрства культуры БССР. У **1975** годзе была арганізавана праца метадычнага, бібліяграфічнага аддзелаў. У **1976** годзе знойдзена асобнае памяшканне для аддзела камплектавання і апрацоўкі адзінага фонду.

Тры гады працы, звязанай з дзяржаўнай цэнтралізацыяй, былі вельмі цяжкімі для работнікаў гарадскіх бібліятэк. Кабінетаў для работы не было: метадысты і бібліёграфы працавалі ў чытальнай зале. Бушнева А.А. мела працоўнае месца на абанеменце за стэлажамі з кнігамі, дзе за невялікім сталом павінна была весці і гаспадарчую, і кіруючую работу, маючы толькі адну пішучую машынку на ўсе працэсы работы і тэлефон.

Пасля неаднаразовых зваротаў дырэктара у гарвыканкам у **1980-1984** гадах была часткова пашырана плошча гарадской цэнтральнай бібліятэкі за кошт жылога фонду (адсялення жыльцоў кватэр жылога дома). З'явіліся нарэшце кабінеты дырэктара, метадыста і бібліёграфа.

За перыяд працы на пасадзе дырэктара А.А.Бушневай давялося адкрываць філіял №4 (вул. Дамброўскага,55), філіял №8 (БЛК, 43), філіял №9 (на той час па вул. Горкага), філіялы №№10,11 (вул.Пестрака, 56а), пераводзіць у новае памяшканне філіял №6 (пр-т Касманаўтаў, 4а). Гэта далося нялёгка. Па ўспамінах Аляксандры Аляксандраўны, ёй неаднойчы даводзілася ісці на канфлікты з намеснікам старшыні гарвыканкама Бутвілоўскай. Падтрымку дырэктару ГЦБС аказвалі загадчыкі аддзела культуры Кот В.В., затым Юрэчка У.У.

Бушнева Аляксандра Аляксандраўна запісала свае ўспаміны пра работу сістэмы бібліятэк: ***"Штомесячна праводзіліся сходы, дзе прысутнічалі загадчыкі філіялаў, на якіх падводзіліся вынікі работы і ставіліся задачы на будучы месяц. Штоквартальна праводзіліся семінары і заняткі школы прафесійнага майстэрства сумесна з бібліятэкарамі школ. Абавязкова на семінарах ці занятках школы прафесійнага майстэрства паказваліся масавыя мерапрыемствы. Вялікую дапамогу ў рабоце аказвалі і прафсаюзныя сходы, якія адбываліся штоквартальна. На іх падводзіліся вынікі сацыялістычнага спаборніцтва, што з'яўлялася вялікім стымулам у паляпшэнні работы кожнай бібліятэкі ЦБС. Цікава праходзіў конкурс сярод маладых бібліятэкараў "А-ну, дзяўчаты!", арганізатарам якога і з'яўляўся прафком. Рэгулярна ў красавіку бібліятэкары выходзілі на***

***працоўныя суботнікі ў парк (цяпер парк імя Жылібера).***

***Амаль усе загадчыцы з’яўляліся членамі метадычнага савета пры аддзеле культуры гарвыканкама, членамі педагагічнага савета школ сваёй зоны абслугоўвання. Я была сакратаром партыйнай арганізацыі работнікаў культуры, затым перадала сакратарства Рыбалка Г.І., на той час загадчыцы філіяла №4, як самаму творчаму, адукаванаму і ініцыятыўнаму работніку.***

***За час работы дырэктарам гарадской цэнтральнай бібліятэкі і дырэктарам ЦБС я двойчы была дэпутатам гарадскога савета дэпутатаў працоўных”.***



**Рыбалка Галіна Іванаўна (1950),**

**– загадчык філіяла №4, ст. бібліятэкар ГЦБ, загадчык філіяла №3 (1975-1980), загадчык аддзела камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду ГЦБ (1980-1985), дырэктар Гродзенскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы і Гродзенскай гарадской цэнтральной бібліятэкі імя А.Макаёнка (1987-2009)**

**Галіна Іванаўна Рыбалка** нарадзілася 22 лістапада **1950** года ў горадзе Слонім Гродзенскай вобласці ў сям’і рабочага. У **1971** годзе скончыла навучанне ў Магілёўскім бібліятэчным тэхнікуме імя А.Пушкіна. З **1971** да **1975** года працавала загадчыкам Масалянскай сельскай бібліятэкі Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці. Была сакратаром камсамольскай арганізацыі саўгаса “Бераставіцкі”. У **1975** годзе пераехала ў Гродна.

З **1975** па **1987** гады працавала ў Гродзенскай гарадской ЦБС на пасадах загадчыка філіяла №4, старшага бібліятэкара ГЦБ імя А.Макаёнка, загадчыка філіяла №3, загадчыка аддзела камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду ГЦБ імя А.Макаёнка. У **1980** годзе атрымала дыплом аб вышэйшай прафесійнай адукацыі пасля заканчэння завочнага аддзялення Мінскага інстытута культуры.

У сакавіку **1987** года прызначана на пасаду дырэктара Гродзенскай ГЦБС, якую займала да **2009** года. За перыяд працы Г.І.Рыбалка на пасадзе дырэктара ў структуры і арганізацыі работы бібліятэчнай сістэмы адбыліся значныя змены. У **1987** годзе былі адкрыты для жыхароў Прынёманскага мікрараёна новыя філіялы №10 і №11 на вуліцы Пестрака. Цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка ўзначаліла 13 гарадскіх бібліятэк-філіялаў. У **1989**

годзе па вуліцы Ліможа быў адкрыты бібліятэчны пункт для абслугоўвання насельніцтва мікрараёна Дзевятоўка. У **2000** годзе цэнтральная дзіцячая бібліятэка пераехала ў новае адрамантаванае памяшканне па вуліцы Цітова, 12. Умовы працы бібліятэкараў, абслугоўвання юных карыстальнікаў значна палепшыліся. У **2006** годзе аддзел камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду з памяшкання па вул. Камарова, 5 быў пераведзены ў новае адрамантаванае памяшканне па вуліцы Кляцкова, 104, што значна палепшыла ўмовы працы калектыву. У **2009** годзе ў склад гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы ўвайшоў яшчэ адзін філіял №12 – спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку. Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка ўзначаліла 14 філіялаў.

Хуткімі тэмпамі пачала ўмацоўвацца матэрыяльна-тэхнічная база бібліятэк. З **1997** года ў гарадскія бібліятэкі пачалі набывацца камп'ютэры. Быў зроблены першы крок на шляху аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў. З **2000** года быў аўтаматызаваны працэс камплектавання і апрацоўкі новых паступленняў. У **2005-2006** гадах праведзена поўная аўтаматызацыя дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі па рэгістрацыі і абслугоўванню чытачоў, стварэнню і выкарыстанню электроннага каталога. Пашырыць інфармацыйныя магчымасці цэнтральнай бібліятэкі дапамог створаны ў **2000** годзе на яе базе публічны цэнтр прававой інфармацыі.

За перыяд працы г.І.Рыбалка на пасадзе дырэктара у сістэме бібліятэк з'явіліся новыя накірункі дзейнасці ўстаноў па абслугоўванню сацыяльна-неабароненых катэгорый насельніцтва, моладзі. Пры кожнай бібліятэцы-філіяле ў перыд **1987-1990** гг. былі створаны клубы па інтарэсах для дзяцей “Мазаіка” (філіял №11), “Пралеска”(філіял №6), для моладзі “Толькі па пятніцах” (філіял №10), для людзей пажылога ўзросту “Сябрына” (філіял №1), “Кнігалюб” (філіял №4). Амаль усе яны плённа працуюць да цяперашняга часу. З самага пачатку кіраўніцтва бібліятэчнай сістэмай Галіна Іванаўна стала ініцыятарам стварэння клуба творчай інтэлігенцыі горада, які аб'ядноўваў пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў, кіраўнікоў мясцовай улады. Мерапрыемствы клуба праводзіліся штомесячна ў бібліятэцы-філіяле №6.

Пад кіраўніцтвам Рыбалка Г.І. штогадова праводзіліся значныя гарадскія мерапрыемствы на базе кінатэатра “Кастрычнік”. З **1990** да **2000** года ў майскія дні арганізоўваўся **Злёт юных талентаў**, у якім бралі ўдзел школьнікі горада – юныя паэты і мастакі. Работы творцаў ацэньвала кампетэнтнае журы, у склад якога ўваходзілі знакамітыя мастакі і пісьменнікі горада. Узнагароды і дыпломы пераможцы атрымоўвалі ў атмасферы святочнага канцэрта, на які збіраліся дзеці і бацькі, настаўнікі і супрацоўнікі ўстаноў культуры. Мерапрыемства актыўна асвятлялася ў мясцовых сродках масавай інфармацыі.



Па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле дырэктара гарадской бібліятэчнай сістэмы з **1995** да **2005** года да Дня Перамогі для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны Кастрычніцкага раёна горада Гродна праводзілася свята “За Айчыну, свабоду і гонар”. Мерапрыемства, акрамя арганізацыі канцэртнай праграмы і выступленняў шаноўных гасцей горада з віншаваннямі, патрабавала пошуку сродкаў для падарункаў, кветак, пачастункаў. Свята праходзіла ў форме “агеньчыка”, падбіраліся канцэртныя нумары для віншавання гасцей за кожным прыгожа сэрвіраваным столікам. Усе арганізацыйныя і фінансавыя пытанні вырашаліся сіламі дырэктара і супрацоўнікаў гарадскіх бібліятэк.



Свята да Дня Перамогі ў кінатэатры “Кастрычнік”. 1995 год.

Па ініцыятыве дырэктара з **1987** года і да сённяшняга часу на сцэнах дамоў культуры горада штогадова праводзяцца **свята дзіцячай і юнацкай кнігі** для школьнікаў "Падарожжа ў Кнігаград", з **1994** года – **свята беларускага пісьменства** "Наш духоўны скарб".



Свята беларускага пісьменства ў кінатэатры “Кастрычнік” 1994-1995 гг. Выступленні “Гарадзенскіх дудрыкаў” (кір.Я.Петрашэвіч), Гродзенскай капэлы

З **1997** года па ініцыятыве Г.І.Рыбалка новыя накірункі атрымала масава-інфармацыйная дзейнасць гарадскіх бібліятэк. Былі распрацаваны і рэалізоўваюцца да сённяшняга часу шэраг бібліятэчных праграм масава-інфармацыйнай дзейнасці разам з грамадскімі арганізацыямі і творчымі саюзамі горада. Сярод іх праграма духоўнага выхавання насельніцтва сумесна з



Гродзенскім дзяржаўным музеем гісторыі рэлігіі і Гродзенскай епархіяй "Абуджэнне да духоўнага жыцця", праграма па рабоце з дзецьмі-інвалідамі сумесна са спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі "Мы і асаблівыя дзеці", праграма па экалагічнаму выхаванню сумесна з сярэднімі школамі і Гродзенскім заапаркам "Зямля – наш агульны дом", праграма “Нацыянальная мазаіка” па супрацоўніцтву з нацыянальна-культурнымі грамадскімі аб’яднаннямі ўкраінцаў “Барвінак”, літоўцаў “Тэвіне”, яўрэяў “Менора”, татар “Дуслык”.

Высокія патрабаванні прад’яўляліся кіраўніком ГЦБС да калектыва па арганізацыі на належным узроўні краязнаўчай дзейнасці. Былі створаны летапісы дзейнасці бібліятэк. Збіраліся гісторыка-дакументальныя матэрыялы пра знакамітых гараджан, якія сваёй творчай дзейнасцю ўнеслі значны ўклад у развіццё культуры Гродна. Былі сабраны і афармлены матэрыялы пра заслужаных дзеячоў культуры А.К.Шыдлоўскага, А.С.Чопчыца, Л.Д.Ляшэнка, самадзейнага кампазітара Я.К.Петрашэвіча, дзіцячага паэта В.С. Кудлачова і інш.

Аб творчым падыходзе Г.І.Рыбалка да бібліятэчнай справы, асабістых якасцях працаздольнага чалавека і таленавітага кіраўніка сведчаць узнагароды і перамогі, якія атрымоўвала ГЦБС пад яе кіраўніцтвам. Па выніках **2001** года ГЦБ імя А.Макаёнка стала пераможцай абласнога конкурсу публічных бібліятэк **“Бібліятэка – інфармацыйны цэнтр рэгіёну”.** Гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма за выкананне планавых паказчыкаў і якасную арганізацыю абслугоўвання насельніцтва стала пераможцай абласнога конкурсу **“Лепшая ўстанова культуры 2003 года”.** Рашэннем Гродзенскага гарвыканкама №137 ад 9 сакавіка **2005** года “Аб выніках спаборніцтва прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый горада “За дасягненне высокіх паказчыкаў у эканамічным і сацыяльна-культурным развіцці **ў 2004** годзе” гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма была вызначана пераможцай, атрымала **Ганаровы пераходны сцяг** Гродзенскага гарвыканкама і грашовую прэмію.



З **2010** года Г.І.Рыбалка прадоўжыла працу на карысць гарадской ЦБС. Яна арганізоўвае адміністратыўна-гаспадарчую работу ў ГЦБС, актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Галіна Іванаўна з’яўляецца членам Прэзідыума Гродзенскага абкама прафсаюзаў работнікаў культуры, старшынёй пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі і старшынёй пярвічнай ветэранскай арганізацыі ГЦБС, членам Савета ветэранаў Кастрычніцкага раёна г.Гродна.

За перыяд працы Г.І.Рыбалка на чале прафсаюзнага камітэта, дзякуючы яе энтузіязму і энергіі, былі арганізаваны шматлікія экскурсійныя паездкі.



Паездка ў Брэст. 2012 год.



Аглядаем Мірскі замак. 2011

Калектыў пабываў у паездках па старажытных замках Беларусі – наведаў Нясвіжскі палац, Мірскі замак, музей А.Міцкевіча ў Навагрудку, падарожнічаў па Аўгустоўскім канале з прыпынкам каля палацава-паркавага комплексу ў Свяцку, наведаў мемарыяльны комплекс “Брэсцкая крэпасць-герой”, Брэсцкі музей чыгуначнай тэхнікі, страусіную ферму ў Кобрынскім раёне.

Па ініцыятыве Г.І.Рыбалка з **2001** года ўрачыта адзначаецца Дзень бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Калектыў выязджае на базы адпачынку Гродзенскага раёна ці наведвае кафэ. Цікавая гульнёва-забаўляльная праграма з віншаваннямі ад адміністрацыі, прафкама, кіраўнікоў іншых устаноў культуры былі запамінальнымі для кожнага супрацоўніка бібліятэк.




Рыбалка Г.І. з’яўляецца аўтарам выдання “Хто мы такія?”, прысвечанага ветэранам бібліятэчнай працы. Біяграфічны даведнік выйшаў у **2011** годзе і з’яўляецца адзіным падобным выданнем сярод шматлікіх выданняў устаноў культуры Гродзеншчыны.

За час працы Рыбалка Г.І. неаднаразова асабіста ўзнагароджвалася. Сярод яе ўзнагарод Ганаровая грамата Міністэрства культуры і друку ў **1995** годзе, Ганаровая грамата Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў у **1995** і **2000** гадах, Ганаровая грамата ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама і Гродзенскага абласнога прафсаюза работнікаў культуры ў **1998** годзе, Ганаровая грамата Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта ў **2000** і **2005** гадах, Ганаровая грамата Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры ў **2003** годзе, Ганаровая грамата Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў ў **2007** годзе, Ганаровая грамата Гродзенскага аблвыканкама ў **2009** годзе, Ганаровая грамата Прэзідыума савета Гродзенскага абласнога аб’яднання прафсаюзаў у **2010** годзе.

Рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь №8 ад **18.10.2000** Рыбалка Г.І. узнагароджана Ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры”.

## Дадатак №2. Галерэя партрэтаў супрацоўнікаў



## Пасляслоўе

У цікавай гісторыі Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Макаёнка адлюстравана не толькі станаўленне і шлях самой бібліятэкі ад гарадской да цэнтральнай, якая ўзначальвае сетку з **14** бібліятэк-філіялаў горада, але наогул гісторыя бібліятэчнай справы рэспублікі. Гісторыя бібліятэкі пакідае ўражанне шматгадовай барацьбы з цяжкасцямі, блуканняў па пакутах у пошуку свайго куточка, дастойнага і дастатковага.

Спадзяваннямі выправіць становішча з недахопам плошчаў для захавання кніжнага фонду і правядзення масава-інфармацыйнай работы жылі бібліятэкары 40-х і 50-х гадоў мінулага стагоддзя. Надзея на дастойнае памяшканне не памірала і ў бібліятэкараў 90-х. Змяняліся палітычны строй, улады, кіраўнікі ўпраўленняў і аддзелаў культуры… Але і ў **2013** годзе ў бібліятэкараў захавалася тая ж праблема – недахоп плошчаў і нізкі ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы. Прыстасаванае памяшканне на першым паверсе трохпавярховага жылога дома, якое бібліятэка артымала ў **1959** годзе, не рамантавалася з **1998** года (у **1998** годзе быў праведзены апошні бягучы рамонт памяшканняў). Яно не адпавядае патрабаванням да арганізацыі прасторы сучаснай бібліятэкі, амаль поўнасцю захавала свой першапачатковы дызайн з **1959** года. Мала змяніўся і знешні выгляд будынку з **1959** года. Да гэтага часу будынак жылога дома не меў капітальнага рамонту. Структурныя падраздзяленні ГЦБ імя А.Макаёнка (аддзел камплектавання, апрацоўкі і арганізацыі адзінага фонду, аддзел бібліятэчнага маркетынгу) з-за недахопу плошчаў размяшчаюцца па іншых адрасах, што ўплывае на якасць і эфектыўнасць арганізацыі работы. Але плошчы цэнтральнай бібліятэкі ўсё роўна не хапае для работы бібліяграфічнай службы, публічнага цэнтра прававой інфармацыі, правядзення пасяджэнняў клубаў па інтарэсах, іншых мерапрыемстваў для насельніцтва.

Прэзентабельнага, сучаснага, дастойнага аблічча Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А.Макаёнка не набыла, хоць і з’яўляецца цэнтральнай бібліятэкай абласнога горада. У параўнанні з гарадскімі цэнтральнымі бібліятэкамі іншых абласных цэнтраў яна знешне выглядае як установа-помнік камуністычнага мінулага, рэтраэлемент гарадской культуры сярэдзіны ХХ стагоддзя.

Спадзяваннямі на выпраўленне становішча жывуць бібліятэкары ў **2013** годзе. І надзея бібліятэкараў, неўміручая і нязгасная, дазваляе ім па-ранейшаму самааддана працаваць і не падаць духам. Напэўна, XXI стагоддзе прынясе нарэшце ў душы і розумы дзяржаўных мужоў перакананне, якое выказаў грамадскі дзеяч, мастак, філосаф, педагог Мікалай Рэрых: «Бібліятэка - гэта і месца працы, і храм думкі, і навукова - даследчы цэнтр, і лабараторыя, і музей, і месца высокіх радасцяў розуму і вачэй». Такім чынам, гарадской бібліятэцы Гродна ёсць да чаго імкнуцца, пажадаем, каб хвалі часу нарэшце сталі для яе спрыяльнымі, стваральнымі, свежымі як ветрык пераменаў…

## Змест

УСТУП ........ 1

ЧАСТКА I. НЯЛЁГКАЕ МІНУЛАЕ (1946-1986) ........ 2

ЧАСТКА II. НЕСПАКОЙНАЕ ЎЧОРА (1987-2010) ........ 25

ЧАСТКА III. ЦІКАВАЕ СЁННЯ І ФАНТАСТЫЧНАЕ ЗАЎТРА (2011 – 2012) ........ 29

ЧАСТКА IV. ГІСТОРЫЯ БІБЛІЯТЭКІ Ў АСОБАХ ........ 38

ДАДАТАК №1. БІЯГРАФІІ КІРАЎНІКОЎ ........ 41

ДАДАТАК №2. ГАЛЕРЭЯ ПАРТРЭТАЎ СУПРАЦОЎНІКАЎ ........ 50

ПАСЛЯСЛОЎЕ ........ 51

ЗМЕСТ ........ 52

*Кніжная скарбніца ў хвалях часу*

**Гісторыя і сучаснасць Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А.Я.Макаёнка**

Гістарычны нарыс

Укладальнік: Свірыда Наталля Рыгораўна

Рэдактар: Ілюшына Іна Мікалаеўна

Камп’ютарная вёрстка: Свірыда Н.Р.